

ЛЮБІ СЯБЕ, КАБ ПАЛЮБІЦЬ ЖЫЦЦЁ

Сямейная газета

ЦІ ЛЁГКА СКРАСЦІ КАРАЛІ АД CARTIER 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 122 (28738)

# ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ...



Мемарыял ва ўрочышчы Благаўшчына пад Мінскам, дзе падчас вайны знішчалі вязняў лагера смерці «Трасцянец», фактычна гатовы да адкрыцця. Наш фотакарэспандэнт учора ўдзень застаў, як даводзяцца да ладу самыя дробныя нюансы.

*На здымку:* Эльвіра МАРОЗ — эканаміст Уздзенскага ПМК-69. Гэта арганізацыя прымала самы непасрэдны ўдзел ва ўзвядзенні мемарыяла.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КУНЦЭВІЧ, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама:**

*«Падчас свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), як заўсёды, чакаецца шмат розных культурных і забаўляльных мерапрыемстваў з удзелам айчынных і замежных музыкантаў, артыстаў і творчых калектываў. У ліку краін-удзельніц — Беларусь, Расія, Украіна, Эстонія, Літва, Латвія і Польшча. Прычым гэта будуць як артысты і народныя майстры, так і беларускія грамадска-культурныя аб'яднанні замежжа, што вельмі сімвалічна ў Год малой радзімы».*

## КОРАТКА

- **Пытанні пастаў беларускай малочнай прадукцыі абмяркуюць 2 ліпеня міністры аграрных ведамстваў Беларусі і Расіі.**
- У Беларусі прапануюць увесці сацыяльны падатковы вылік па падаходным падатку ў суме расходаў на медыцынскія паслугі.



- **Рыбалоўны фэст пройдзе 30 чэрвеня ў Смалявіцкім раёне.**
- Пытанні ўтрымання і выгулу жывёл у Мінску ў найбліжэйшы час будуць вынесены на абмеркаванне гарвыканкама.
- **Эксперты з Нацыянальнага цэнтра даных пра снег і лёд пры ўніверсітэце Каларада (ЗША) выявілі, што тэмпература ў невялікіх правалах на Усходне-Антарктычным плато можа апускацца да мінус 98 градусаў па Цэльсію.**

ISSN 1990 - 763X

■ Вынаходнікі

## «Мінскі код» Аксёнава і Касцюкоўскага

### Будучыня — за лайтфонамі?

**Тое, што вынайшлі два нашыя навукоўцы, здольна выклікаць рэвалюцыю ў глабальнай сістэме сувязі. Хоць гэта здаецца неверагодным пасля таго, як інтэрнэт і сотавы тэлефон сталі ці не такімі ж банальнымі рэчамі, як пыласос і зубная шчотка. Чаго ўжо яшчэ? Тым не менш існуючыя спосабы перадачы інфармацыі далёкія ад дасканаласці. Дастаткова сказаць, што да гэтага часу немагчымы нармальныя перамовы паміж людзьмі, якія знаходзяцца, напрыклад, у розных падводных апаратах або касмічных караблях. Не кажучы ўжо пра тое, што большасць традыцыйных тэлекамунікацыйных прылад, у тым ліку мабільнікі, шкодныя для здароўя. Спосаб сувязі, які прыдумалі Юрый АКСЁНАЎ і Аляксей КАСЦЮКОЎСКІ, можа паспяхова вырашыць гэтыя праблемы.**



— Прапанаваная намі ідэя заключаецца ў вынікарыстанні ўласцівасцяў святла, — спрабуе як мага прасцей растлумачыць сутнасць справы Юрый Аксёнаў *(на фота)*. — Светлавыя хвалі, як і электрамагнітныя, таксама маюць здольнасць пераносіць розныя сігналы: чалавечую гаворку, музыку, відэакарцінку. На гэтым заснавана работа валаконна-аптычных ліній сувязі. Але паколькі яны ўяўляюць сабой праваднуючу сетку, то шмат у чым абмежаваныя. Мы ж прапануем яшчэ і бесправаднуючу аптычную сістэму. Прынцыпова іншую, якая, у адрозненне ад радыёхвалёвай, запатрабавала больш дасканалай элементнай базы. Нам удалося вынайсці ўнікальны метад мадуляцыі сігналу. Створаны новы спосаб кадзіравання інфармацыі. Мы назвалі яго «Мінскім кодам». Уявіце, што ў вас у руках не традыцыйны айфон, які працуе на радыёхвалях, а мабільнік, арыентаваны на светлавыя імпульсы. Такі апарат — лайтфон — таксама наша ноу-хаў.

СТАР. 4

■ Разумныя грошы

## ПЯЦЬ «ЗЛАДЗЕЯЎ», ЯКІЯ ЗАБІРАЮЦЬ ВАШЫЯ КРОЎНЫЯ

**Калі мы задумваемся аб фінансах, то часцей за ўсё ацэньваем свой дабрабыт зыходзячы з магчымасці часта здзяйсняць буйныя пакупкі. Аднак з часам нават дробныя затраты ператвараюцца ў істотныя выдаткі. З дапамогай сертыфікаваных спецыялістаў па фінансавым планаванні мы падабралі пяць рэчаў, на якія ідзе неапраўдана шмат грошай.**

### Другая аднолькавая кофтачка

Я б гэтую манію купляць з зайздросным пастаянствам падобныя ці абсалютна аднолькавыя рэчы назваў бы «дублікацызмам». Людзі часта трацяць грошы на тое, што ўжо ёсць у доме. Гэта адбываецца з-за неарганізаванасці, прычым праблема датычыцца самых розных рэчаў: ад прадуктаў да адзення. Эксперты раяць перад паходам у краму правяраць змесціва шаф і халадзільніка. А часам правераць не перашкодзіць і аператыўную памяць уласнага «кацялка». Напрыклад, мая жонка абавязкова раз на тры ці шэсць месяцаў купляе бляшанку (ці дзве) печані траскі. Проста захацелася або тавар на зніжцы быў.

Салата, дзе прысутнічаюць гэтыя кансервы, вельмі пажыўная. Дапускаю, што нават карысная і неабходная, але... У нашай сям'і гэтая салата робіцца выключна на Новы год і на 23 лютага (не ведаю, па якой прычыне). У астатні час есці гэты далікатэс ніхто (у тым ліку і жонка) не жадае. У выніку ў нас ужо тры бляшанкі са скончаным тэрмінам прыдатнасці.

Мае суседзі днямі выкідалі ёмістасці з пратэрмінаванай бытавой хіміяй. У суседавай жонкі свае «прусакі» ў галаве. А ў вас няма запасаў чагосьці вельмі патрэбнага? Так, на чорны дзень?..

СТАР. 3

# ЛЮДЗІ, ЯКІЯ БУДУЮЦЬ КРАІНУ

**Зусім хутка — адно з галоўных дзяржаўных свят. Дзень Незалежнасці мы адзначым праз лічаныя дні, а для некаторых свята пачалося яшчэ ўчора. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка напярэдадні ўрачыстай ліпеньскай падзеі ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў зале Палаца Незалежнасці сабраліся сапраўды таленавітыя, працавітыя, адданыя сваёй справе спецыялісты. І тое, што ўзнагароджванне прадстаўнікоў самага шырокага кола прафесій адбываецца перад 3 ліпеня, сімвалічна. Бо калі гутарка заходзіць аб незалежнасці краіны, маецца на ўвазе перш за ўсё яе народ.

«Наш суверэнітэт — гэта людзі, якія штодзённа, шчыра і сумленна выконваюць сваю работу, — лічыць беларускі лідар. — Захоўваюць мір і парадак на роднай зямлі, застаюцца ўзорам мужнасці і вернасці службоваму абавязку. Умацоўваюць эканамічную стабільнасць, працуюць на вытворчасцях, будоўлях, у навуковых лабараторыях, на фермах і ў палях. Забяспечваюць сацыяльную падтрымку насельніцтва, працуючы ў сферах аховы здароўя, адукацыі, у грамадскіх арганізацыях. Фарміруюць імідж краіны сваімі спартыўнымі перамогамі і дасягненнямі».



Фота БелТА.

Прэзідэнт уручае ўзнагароду Аляксандру ВАСІЛЬЕВУ.

Слава заўжды знаходзіць таго, хто ў сваёй працы шчыра імкнецца прынесці карысць Айчыне, для каго ўзнагародай у першую чаргу з'яўляецца вынік яго дзейнасці. «Менавіта такія людзі, захопленыя сваёй справай, сапраўдныя прафесіяналы і патрыёты Радзімы, сабраліся ў гэтай зале. Вы і ёсць самая надзейная апора нашай дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прысутныя лёгка пазналі сярод узнагароджаных знакамітага беларускага фрыстайліста — Антона Кушніра, які зараз з'яўляецца спартсменам-інструктарам нацыянальнай каманды Беларусі па фрыстайле. «Зараз пачаўся новы, летні сезон. Прайшоў адпачынак, і цяпер, як на далёкае мінулае, гляджу на тыя Алімпійскія гульні, што былі зімой. Мы правялі самааналіз, выявілі дапушчаныя памылкі, над якімі яшчэ давядзецца папрацаваць у летнім сезоне. Мы прыкладзём максімум намаганняў, каб рухацца наперад. Спадзяюся, здароўе будзе дазваляць гэта зрабіць і ў нас атрымаецца добра выступіць гэтай зімой і на этапах Кубка свету, і на чэмпіянаце свету», — падзяліўся планамі алімпійскі чэмпіён.

А гісторыя Аляксандра Васільева, першага намесніка начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама — начальніка крымінальнай міліцыі, палкоўніка міліцыі — выклікала рэзананс мінулай восенню. У лістападзе ў Магілёве ўзброены злачынца напаў на аддзяленне банка, патрабуючы, каб яго заложнікам стаў прадстаўнік банка. З усіх прысутных сілавікоў у цывільным быў толькі Аляксандр Васільеў. Ён прадставіўся супрацоўнікам банка, увайшоў у давер да злачынцы, угаварыў яго адпусціць наведвальнікаў і работнікаў аддзялення, а сам на машыне адвёз злодзея ад будынка. Зламысніка пасля пагоні затрымалі. Пры гэтым Аляксандр Васільеў прызнаецца, што зараз успрымае гэта здарэнне як працоўны момант і нават больш захапляецца мужнасцю жанчын — супрацоўніц банка, якіх не вучылі, як трэба дзейнічаць пад дулам пісталета, але яны зрабілі ўсё правільна.

Сярод тых, хто атрымаў узнагароды, і кіраўнік будаўнічага прадпрыемства, якое ўдзельнічала ва ўзвядзенні Палаца Незалежнасці. У Святланы Аскіравай, дырэктара таварыства «Аргбуд», якая больш за чатыры дзесяцігоддзі працуе ў будаўнічай сферы, у гэты дзень будынак выклікаў буру эмоцый: «Вонкавы выгляд значна палепшыўся дзякуючы мастакам, дызайнерам, якія плённа папрацавалі над інтэр'ерам. А якія жырандолі! Нават не верыцца зараз, што і мы далучыліся да будаўніцтва», — усміхаецца дырэктар.

«Не так часта, але бываюць такога плана сур'ёзныя мерапрыемствы, калі не толькі гэты зал, збудаваны рукамі нашых тварцоў, але і ўвесь Палац Незалежнасці напаўняецца асаблівым зместам. Тут ствараецца асаблівая аўра. Для мяне асабіста яна захоўваецца не на адзін дзень. Такія падзеі падымаюць настрой, даюць дадатковыя сілы, каб працаваць так, як гэта робіце вы, — прызнаўся Прэзідэнт. — Працаваць заўжды прыемна і настрой заўжды добры, калі ёсць здароўе. Калі яго няма, напэўна, складана думаць пра працу. Таму я жадаю вам перш за ўсё — моцнага здароўя. Вы — тая каштоўнасць нашай нацыі і той святы фонд, які застанецца новым пакаленням, што прыйдуць пасля нас. Беражыце свой гонар. Вы — здабытак нашай краіны».

**Веранiка ПУСТАВIТ.**

# НЯМА ПРАБЛЕМ, ЁСЦЬ ІДЭІ

**У беларускую сталіцу на сустрэчу з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам прыехаў прэзідэнт, старшыня праўлення расійскага Ашчаднага банка Герман Грэф. У Беларусі даччынай арганізацыяй структуры з'яўляецца «БПС-Ашчадбанк».**

«Я рады, што нам даводзіцца рэгулярна сустракацца. Вы мяне трымаеце ў курсе спраў па ўсіх пытаннях не толькі Ашчаднага банка і яго філіяла, але і банкаўскай справы ўвогуле, паколькі даводзіцца вывучаць крыху глыбей некаторыя матэрыялы. Чарговы раз я ўдзячны вам за інвеставанне ў Беларусь, крэдытаванне нашай эканомікі — больш за $4 мільярды. Гэта неблагія аб'ёмы», — лічыць беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы спецыяльна паклікаў на двухбаковую сустрэчу прадстаўнікоў беларускага банкаўскага сектара, каб прадметна абмеркаваць праблемы, якія існуюць ва ўзаемаадносінах з Ашчадным банкам. «Увогуле на фоне таго, што адбываецца нават у суседніх з намі краінах, я задаволены тым, што ў нас з Ашчадбанкам добрыя адносіны. Праблемы заўжды былі і будуць, але няма такіх крытычных момантаў, якія маглі б ускладніць нашы адносіны», — выказаў упэўненасць Прэзідэнт і прапанаваў Герману Грэфу расказаць аб праблемах, калі тыя ёсць.

«Я прыехаў не з праблемамі, а з прапановамі, таму што ёсць цэлы шэраг ідэй, што можна зрабіць», — адказаў кіраўнік банка. Па выніках сустрэчы ён заявіў журналістам, што банк мае намер пашыраць аб'ём інвестыцый у Беларусь. Адна з тэм размовы датычылася развіцця Ашчаднага банка ў Беларусі. «Дамовіліся аб тым, што мы пашыраем аб'ём нашых інвестыцый у Беларусь, — адказаў Герман Грэф. — Мы зараз мяняем кіраўніцтва нашага банка (ААТ «БПС-Ашчадбанк». — «**Зв.**»). Хутка прыступіць да дзейнасці новы кіраўнік банка».

«Мы дамовіліся аб пашырэнні экспартнага крэдытавання паставак прадукцыі з Беларусі ў Расію. Дамовіліся па пашырэнні практычна ў два разы аб'ёмаў закупкі беларускімі прадпрыемствамі расійскай прадукцыі па схемах падтрымкі з удзелам урада як Беларусі ў першым выпадку, так і Расіі ў другім выпадку. Трэцяе — мы павялічваем ліміты забеспячэння фінансавання прадпрыемствам машынабудавання і энергетыкі (гэта салідная сума) і прадпрыемствам здабыўнага комплексу», — заявіў кіраўнік Ашчаднага банка.

**Веранiка ПУСТАВIТ.**

# ЗА ВЫСОКІ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

## Прэм'ер-міністр уручыў дзяржузнагароды найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў краіны

**Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ па даручэнні Прэзідэнта ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў краіны. Сярод іх больш за 160 чалавек: навукоўцы, сацыяльныя работнікі, урачы, выкладчыкі, работнікі прамысловасці, лясной галіны, аграрыі, будаўнікі, нафтавікі, прадстаўнікі падатковых органаў, дзяржаўныя служачыя, творчая інтэлігенцыя. Усе яны ўдастоены высокіх узнагарод за шматгадовую плённую працу, добрае выкананне службовых абавязкаў, высокі прафесіяналізм.**

«Кожны з вас унёс свой уклад у развіццё незалежнай і квітнеючай Беларусі. Сярод узнагароджаных вялікая група работнікаў аграпрамысловага комплексу краіны. Шмат гадоў таму Беларусь зрабіла стаўку на развіццё сельскай гаспадаркі. Час паказаў, што выбар гэты быў абсалютна правільны», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

На яго словах, забяспечваючы патрэбы айчыннага рынку, беларускія прадпрыемствы захоўваюць таксама і свае экспартныя пазіцыі.

«Мы зарабляем на экспарце харчавання больш за 5 млрд долараў у год. Задача давесці гэты паказчык да 7 млрд. Нашы прадукты харчавання пастаўляюцца на рынкі больш як 60 краін свету», — дадаў кіраўнік урада.

Высокіх узнагарод удастоены прадстаўнікі спажывецкай кааперацыі краіны. Сярод узнагароджаных таксама была група медыцынскіх работнікаў, прадстаўнікі сферы адукацыі — настаўнікі і кіраўнікі ўстаноў розных узроўняў.

Высокія ўзнагароды таксама ўручылі прамысloўцам і энергетыкам. «Сёння з упэўненасцю можна сказаць што прамысловасць Беларусі выйшла з рэцэсіі і набрала ўстойлівы паказчык росту. Тэмп росту прамысловай вытворчасці ў мінулым годзе склаў 106,1 %, а за пяць месяцаў гэтага года — 108,3 %. Ёсць усе перадумовы, каб гэты тэмп сёлета быў не меншы», — сказаў прэм'ер-міністр.

Таксама сярод узнагароджаных былі дарожныя рабочыя. Дзякуючы іх намаганням у краіне актыўна ідзе рэканструкцыя аўтамабільных дарог. Высокія ўзнагароды заслужылі прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі. Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што дзяржава будзе падтрымліваць таленавітых і адораных творчых асоб, асабліва тых, хто праслаўляе краіну і натхняе мільёны.

«Напярэдадні галоўнага дзяржаўнага свята, хачу павіншаваць вас з Днём Незалежнасці краіны. Дата 3 ліпеня сімвалізуе адзінства нашага міралюбівага грамадства, яго мужнасць і гераізм, павагу да традыцый і пераемнасць пакаленняў. Гэтае свята ў сэрцы кожнага, хто ведае цану міру, стабільнасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні», — рэзюмаваў Андрэй Кабякоў.

***Ілья КРЫЖЭВІЧ.***

**Сярод узнагароджаных — намеснік галоўнага рэдактара «Звязды» Анатоль СЛАНЕЎСКІ. Наш калега атрымаў Падзяку Прэзідэнта за шматгадовую і плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Шчыра віншуем Анатоля Аркадзевіча і жадаем новых дасягненняў!**

■ Парламенцкі дзённік

# ПЕНСІІ, БЯЗВІЗ І АЗЕЛЯНЕННЕ ТЭРЫТОРЫІ

## Абмеркавалі дэпутаты на чарговым пасяджэнні сесіі

**Учора ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу разглядалася 11 пытанняў. Яны датычыліся выканання бюджэту за 2017 год, змен у некаторыя законы і кодэксы.**

**Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах**, расказала, што за мінулы год выкананы паказчыкі бюджэту па расходах і даходах. «У цэлым выкананне бюджэту па даходах склала 19,8 млрд рублёў, па расходах — 17 млрд рублёў. Прафіцыт — 2,8 млрд рублёў. Практычна па ўсіх асноўных даходных крыніцах існуе прырост да ўзроўню 2016 года дзякуючы таму, што ў 2017 годзе намецілася станоўчая дынаміка ў нашай эканоміцы. Скláліся спрыяльныя знешнеэканамічныя ўмовы — гэта перш за ўсё рост цэн на нафту і калійныя ўгнаенні», — рэзюмавала старшыня камісіі. Сярод асноўных даходаў бюджэту, напрыклад, паступленні ад падатку на дабаўленую вартасць. Яны павялічыліся на 12,3 % і склалі 6,4 млрд рублёў.

Тэму пенсій і дзейнасці Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва пракаментавала **Людміла НІЖЭВІЧ, член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах**. Яна адзначыла, што, улічваючы паэтапнае павышэнне пенсійнага ўзросту, гаварыць аб нейкім скачку паступленняў не варта. Але ў сярэднім дзесьці 100 млн рублёў (з улікам дадатковых паўгода) паступіла ў бюджэт. За 2017 год даходы фонду склалі 12,5 млрд рублёў, расходы — 12,3 млрд рублёў. Нягледзячы на тое, што даходы фонду выраслі на 6 %, запланаваны аб'ём сродкаў не забяспечаны, таму на працягу года праводзілася ўдакладненне па даходах і расходах.

Абноўлены закон «Аб нарматыўных прававых актах» павінен зрабіць нашы законы больш зразумелымі. Як расказаў **Віталь Уласевіч, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве**, у ім урэгуляваны поўнасцю ўвесь працэс нарматворчасці ў краіне. У дзейны Закон «Аб нарматыўных прававых актах» канцэптуальныя змяненні не ўносіліся больш за дзесяць гадоў. Тым часам у новым варыянце замацаваны шэраг новаўвядзенняў, такіх як грамадскае абмеркаванне і інстытут ацэнкі рэгулюючага ўздзеяння. Апошні, у прыватнасці, прадугледжвае, што на стадыі распрацоўкі законапраекта профільнае міністэрства будзе высвятляць у бізнесу, як тая ці іншая норма адлюструецца на гаспадарчай дзейнасці суб'екта.

**Валерый ВАРАНЕЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах**, расказаў, калі нам чакаць бязвізу з Кітаем. На пасяджэнні разгледзелі гэта пытанне. Далей яно накіроўваецца ў Савет Рэспублікі. На думку старшыні камісіі, на працягу месяца ўсе афіцыйныя працэдуры могуць быць завершаны. Валерый Варанецкі адзначыў, што адносіны паміж Беларуссю і Кітаем развіваюцца вельмі дынамічна. Гэта датычыцца як гандлю, так і культурных, спартыўных і турыстычных праектаў.

**Ірына КРАЛЕВІЧ, член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы**, на пасяджэнні прадставіла праект змяненняў у закон «Аб раслінным свеце». Ён быў ініцыяваны і распрацаваны групай дэпутатаў. Абноўлены датычацца азелянёных тэрыторый, выдалення і перасадкі раслін, а таксама кампенсуючых мерапрыемстваў.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■

# ПЯЦЬ «ЗЛАДЗЕЯЎ», ЯКІЯ ЗАБІРАЮЦЬ ВАШЫЯ КРОЎНЫЯ

## Тавары па завышанай цане

Адзін і той жа тавар у розных крамах можа каштаваць даражэй або танней. Часам можна сэканоміць прыстойную суму, даведаўшыся цэны ў некалькіх пунктах продажу.

У нас у наваколлі, напрыклад, тры вялікія сеткавыя крамы. І кошты там, як і асартымент, істотна адрозніваюцца. Сёння рыба, крупы і напоі таннейшыя ў адной, затое ў другой, напрыклад, — акцыя на каву, чай і пячэнне. Трымаць гэта ўсё ў галаве — ніякіх мужчынскіх звілін не хопіць. Але. Важна, вядома, разумець, колькі каштуе ваш уласны час: магчыма, выдаткаваўшы на паход па пакупкі лішнюю гадзіну, вы сэканоміце грошы.

## Знак «адкушанага» яблыка

Гэты запал купляць толькі тавары глыбока разрэкламаваных брэндаў называюць хваробай «адкушанага яблыка» (знак кампаніі Apple). Мой знаёмы не пераносіць на дух ніякую тэхнічную навінку, калі на ёй не стаяў вядомы лэйбл. А прадукты вядомых брэндаў каштуюць на парадак даражэй, па сутнасці, за такіх жа двайнікоў. Можна падумаць, што ў яго грошай куры не клююць. І не клююць, таму што сышлі грошыкі на куплю такога «супер».

Магчыма, вы атрымліваеце нейкую асалоду ад брэндаваных прадуктаў? Тым не менш важна зразумець, што ёсць таннейшыя альтэрнатывы, і ўспомніць пра фінансавыя прыярытэты — такія як выплата крэдытаў, — перш чым траціцца на любімыя маркі і прыгожыя ўпакоўкі.

## Аднаразовыя рэчы ці амаль аднаразовыя

Да паразітаў, што з'ядаюць нашы грошы, эксперты прылічваюць рэчы, патрэбныя ненадоўга. Або яны набываюцца пад уздзеяннем эмацыянальнага імгненнага імпульсу.

Можна, напрыклад, адмовіцца ад аднаразовага посуду. Гэта лёгка. А яшчэ варта памятаць, што некаторыя рэчы праслужаць не занадта доўга — і не траціць шмат грошай, скажам, на дзіцячыя прадметы адзення, цацкі і нават прадметы мініяцюрнай мэблі. Нейкія з іх можна знайсці па больш нізкай цане ў інтэрнэце, а нейкія ўвогуле арандаваць у знаёмых і сяброў. А то будзе, як у маёй знаёмай. Яна купіла сваёй паўгадовай дачушцы прыгожыя і дарагія валёнкі. Улетку купіла, а да зімы дзяўчынка з іх ужо вырасла, нават ні разу не абуўшы.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

А яшчэ мой добры сусед днямі вынес з дома два мяшкі мяккіх цацак. Яго дачцэ стукнула 12, а тата да апошняга лічыў, што найлепшым падарункам малой будзе плюшавая кошка або такі ж сабачка.

## Банкаўскія камісіі

Калі вы думаеце, што раз не бераце крэдытаў, то і банкам нічога не плаціце, то вы памыляецеся. Фінансавыя ўстановы ўсюды спрабуюць залезці нам у кішэню. Асобныя банкі бяруць плату за выпуск і штогадовае абслугоўванне картак, амаль усе — за зняцце грошай у чужых банкаматах, за карыстанне авердрафтам, за перавод грошай з карткі на картку. У год за ўсё гэта даводзіцца плаціць дзясяткі, а то і сотні рублёў.

Існуе шмат спосабаў пазбегнуць гэтых збораў: напрыклад, афарміць картку з бясплатным абслугоўваннем або выконваць мінімальныя патрабаванні, пры якіх за яе не трэба плаціць, пераводзіць грошы па рэквізітах рахунку або карыстацца сродкамі з крэдытнай карткі строга ў рамках ільготнага перыяду.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### У ТЭМУ:

#### Упакоўку лепш не выкідаць, бо тавар могуць не прыняць назад

У нашай краіне распрацавалі змены ў закон «Аб абароне правоў спажыўцоў», паведамілі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Ужо 23 снежня гэтага года ў сілу ўступае новая рэдакцыя закона. Усяго ў яго ўнесены 32 папраўкі. У міністэрстве расказалі, якія змены чакаюць пакупнікоў.

Так, пакупнік зможа забраць грошы за вернуты тавар без прадстаўлення пашпарта або іншага дакумента. Зараз для вяртання нярэдка патрабуюць дакумент. Пры гэтым вяртаць тавары трэба будзе з упакоўкай, у якой ён быў набыты. Інакш у краме могуць адмовіцца прыняць яго назад. Магазінам забароняць устанаўліваць розныя цэны і тарыфы на адзін і той жа тавар з-за формы аплаты — наяўнай або безнаяўнай.

Гарантыйны рамонт можа зацягнуцца, а за захоўванне тавару ў майстэрні будуць браць грошы. Зменамі таксама прадугледжана, што тэрмін гарантыйнага бясплатнага рамонту могуць павялічыць з 14 да 30 дзён.

— Папраўка абумоўлена выпадкамі аб'ектыўнай неабходнасці ўстанаўлення больш працяглых тэрмінаў рамонту, напрыклад у сувязі з дазаказам камплектуючых, запасных частак, патрабаваннямі аб ажыццяўленні рамонту на вытворчым абсталяванні вытворцы або яго ўпаўнаважаных асоб, размешчаных на адлегласці.

Пры гэтым уводзіцца абавязак рамонтных арганізацый рабіць праверку якасці дастаўленага ім прадаўцамі тавару на працягу трох дзён. Гэта вырашылі ўвесці для «забеспячэння своечасовага выканання законных патрабаванняў спажыўца». Пры гэтым рамонтныя майстэрні змогуць спаганяць грошы за захоўванне тавару, які працяглы час не забіраюць.

#### Каб і прачытаць можна было

Крамы, якія прадаюць тавары дыстанцыйна праз рэкламу або іншыя інфармацыйныя крыніцы, у тым ліку праз інтэрнэт, абавяжуць паказваць у гэтых крыніцах цану прадукту вызначаным шрыфтам. Яго памер павінен быць не меншы за палову найбольшага памеру шрыфту, які змяшчаецца ў апісанні.

— Гэта дазволіць зрабіць інфармацыю чытэльнай для спажыўцоў і знізіць колькасць выпадкаў увядзення іх у зман адносна кошту пакупкі, — дадаюць у міністэрстве.

#### Абавязковай інфармацыі аб тавары на ўпакоўцы будзе больш

Некаторыя змены датычацца мовы, на якой прыведзена інфармацыя аб тавары. «У законе ўлічана прапанова аб давядзенні інфармацыі «на беларускай і (або) рускай мовах» замест занадта вузкай сённяшняй альтэрнатывы — «на беларускай або рускай мове», — адзначаюць у ведамстве.

Зменамі таксама аптымізавалі патрабаванні да інфармацыі пра тавары і паслугі. Так, закон дапоўнены нормамі аб тым, што да спажыўца павінна даводзіцца інфармацыя:

— пра краіну паходжання тавару, калі адрас вытворцы і краіна паходжання не супадаюць;

— пра клас энергаэфектыўнасці тавараў (па пераліку, прадугледжаным заканадаўствам і тэхнічнымі рэгламентамі). Напрыклад, у маркіроўцы халадзільнікаў, пральных і пасудамыечных машын павінна змяшчацца ўказанне на клас энергаэфектыўнасці бытавой тэхнікі.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ДАНІЯ МОЖА ЗАБЛАКАВАЦЬ ПРАЕКТ «ПАЎНОЧНАГА ПАТОКУ — 2»



Прэм'ер-міністр Даніі Ларс Лёке Расмусен паведаміў, што яго краіна можа прыняць закон, які дазволіць на юрыдычных падставах заблакаваць або адкласці рэалізацыю праекта «Паўночны паток — 2». «Я праведу праз парламент законапраект, які дазволіць нам праводзіць ацэнку сферы знешняй палітыкі ў стандартным працэсе разгляду заявак», — паведаміў Расмусен, перадае ТАСС. Кіраўнік урада выказаў меркаванне, што гэтае пытанне павінна быць вынесена на агульнаеўрапейскае абмеркаванне. Ён падкрэсліў, што варта сур'ёзна і ўзважана прааналізаваць усе рызыкі. Як вядома, «Паўночны паток — 2» — праект пашырэння дзейнага магістральнага газаправода «Паўночны паток», які злучае Расію і Германію па дне Балтыйскага мора.

## ПЕРАГАВОРЫ АБ УСТУПЛЕННІ ТУРЦЫІ Ў ЕС ПРАКТЫЧНА СПЫНЕНЫ

Пра гэта гаворыцца ў выніковай заяве Савета ЕС. «Савет адзначае, што Турцыя аддаляецца ад Еўрасаюза. Перагаворы аб членстве Турцыі практычна ў тупіку, і немагчыма разгледзець адкрыццё або закрыццё новых кірункаў», — адзначаецца ў дакуменце. Савет таксама падкрэсліў, што працягваецца праца па мадэрнізацыі мытнага саюза ЕС — Турцыя. Перагаворны працэс аб прыёме гэтай краіны ў Еўрасаюз пачаўся 3 кастрычніка 2005 года. Каб уступіць у супольнасць, Турцыя павінна паспяхова завяршыць перагаворы з Еўракамісіяй па 33 з 35 перагаворных пунктаў (два не патрабуюць узгаднення). Пасля гэтага дзяржавы-члены павінны аднагалосна прагаласаваць за атрыманне краінай членства ў ЕС.

## СВЕТ АХОПЛІВАЕ АПІЕІДНАЯ ЭПІДЭМІЯ

Злоўжыванне апіеіднымі прэпаратамі становіцца глабальнай эпідэміяй, адзначаецца ў Сусветным дакладзе па наркотыках ААН. Як заўважаецца ў дакуменце, апіяты становяцца прычынай смерці ў больш чым трох чвэрцях усіх выпадкаў смяротных зыходаў у выніку ўжывання наркатычных сродкаў у свеце. Вытворчасць опіуму дасягнула рэкорднага ўзроўню, а маштабы злоўжывання апіеіднымі прэпаратамі выклікаюць асаблівую трывогу, адзначаюць у ААН. Гэтыя прэпараты вырабляюцца альбо з прыроднага опіумнага маку, альбо з сінтэтычных рэчываў, якія аказваюць падобнае ўздзеянне. Да іх адносяцца такія наркатычныя сродкі, як гераін і кадэін.

# ГЕРМАНІЯ ПРАЙГРАЛА ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ І ПАКІНУЛА ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

FIFA WORLD CUP RUSSIA 2018

Учора ўдзень на чэмпіянаце свету вызначыліся ўдзельнікі 1/8 фіналу ў групе F. Шведы цвёрда вырашылі пазмагацца за плей-оф, і, нягледзячы на істотную перавагу мексіканцаў у валоданні мячом, вельмі востра контратакавалі. У другім тайме гэта і прывяло спачатку да двух забітых мячоў у вароты лацінаамерыканцаў, вызначыліся Людвіг Аўгусціньсан з гульні і Андрэас Гранквіст з пенальці. А канчаткова дабіў зборную Мексікі аўтагол яе абаронцы Эдсана Альвараса.

Але, як высветлілася пазней, мексіканцы пасля сваёй гульні, магчыма, плакалі ад шчасця і маліліся на зборную Паўднёвай Карэі. Бо тыя ў паралельным матчы з камандай Германіі стварылі пакуль што самую гучную сенсацыю чэмпіянату. Азіяцкія футбалісты ўсю гульню адбіваліся ад нямецкіх атак, а ў дадатковы час забілі чэмпіёнам свету два галы! Прычым, апошні — у пустыя вароты, калі галкіпер бундэсцім Мануэль Нойер пайшоў дапамагаць сваім палявым гульцам і страціў мяч. У карэйцаў забівалі Кім Ён Квон і Сон Хын Мін. Немцаў напаткаў сапраўдны праклён дзейных чэмпіёнаў свету, якія ў апошнія дзесяцігоддзі не могуць выйсці з групы. Не змаглі зрабіць гэта Францыя ў 2002 годзе, Італія — 2010-м, Іспанія — 2014-м і сёлета — Германія.

Такім чынам у 1/8 фіналу выйшлі шведы і мексіканцы, Германія пакідае мундзіяль і праз два тыдні складвае паўнамоцтвы чэмпіёна свету.

**Іван КУПАРВАС.**

# ЛІДАР ЗАСТАЕЦЦА РАНЕЙШЫМ

**У заключным матчы гэтага круга брэсцкае «Дынама» разграміла на сваім полі «Гарадзею» — 5:2.**

А раней БАТЭ і салігорскі «Шахцёр» не змаглі вызначыць пераможцу — 0:0, «Слуцк» саступіў мінскаму «Дынама» — 0:1, а «Дняпро» прайграў «Тарпеда» (Мінск) — 1:2. «Смалявічы» аказаліся слабейшыя за «Нёман» — 0:1, «Мінск» саступіў «Гомелю» — 0:2, «Прамень» прайграў «Тарпеда-БелАЗ» — 1:3, а «Віцебск» на сваім полі быў мацнейшы за «Іслач» — 2:0. Турнірную табліцу па-ранейшаму ўзначальвае БАТЭ з 32 ачкамі, услед ідзе «Дынама» (Мінск) — 28, тройку замыкае «Віцебск» — 27.

Нагадаем, што сталі вядомыя сапернікі беларускіх клубаў у кваліфікацыі Лігі Еўропы. У першым раўндзе адбору да групавой стадыі турніру сталічнае «Дынама» згуляе з ірландскім «Дэры Сіці», а салігорскі «Шахцёр» — з «Конас Куэй Намадс» з Уэльса. Матчы першага кваліфікацыйнага раўнда адбудуцца 12 і 19 ліпеня. «Дынама» і «Шахцёр» стартуюць вызначаныя паядынкамі. «Дынама-Брэст» у другім раўндзе кваліфікацыі згуляе з грэчаскім «Атрамітасам». Матчы пройдуць 26 ліпеня і 2 жніўня, першы — на полі брастаўчан. Раней стала вядома, што ў кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў барысаўскі БАТЭ ў другім крузе адбору згуляе з пераможцам супрацьстаяння паміж камандамі ХІК (Фінляндыя) — «Вікінгур» (Фарэры).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Шымко збірае сяброў, каб зноў уразіць

**З 26 да 29 ліпеня на беразе ракі Іслач, за 35 кіламетраў ад сталіцы ў Гродзенскім напрамку праходзіць II Міжнародны фестываль «Shimko збірае сяброў».**

Убачыць, як з імправізаванага аэрадрома ўзлятаюць самалёты, верталёты і аэрапланы, палятаць на паветраных шарах, наведаць парк чэшскіх атракцыёнаў і цырк «Шапіто», папарыцца ў палявой лазні і скокнуць у Іслач, паўдзельнічаць у спаборніцтве па паяданні страў, а ўвечары атрымаць асалоду ад музычных калектываў — усё гэта ўжо апрабавана летась і, без сумненняў, ахвотных паўтарыць яшчэ раз будзе абсалютная большасць. Акрамя гэтага, сёлета ўдзельнікаў фестывалю чакаюць прэзентацыі культуры, традыцый і быту іншых краін, якія нават пабудуюць імправізаваную карту свету.

— Пры гэтым ніякага алкаголю на тэрыторыі правядзення фестывалю прадавацца не будзе. Гэта сямейнае свята, дзе кожны зможа далучыцца да спартыўных забаў і знайсці сабе занятак па душы, — адзначае **Кірыл ШЫМКО**.

Уваход для ўсіх ахвотных на фестываль бясплатны. Ад сталічнай станцыі метро Каменная Горка наладжаны рух аўтобусаў і маршрутных таксі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Быкі ўсхадзіліся...

## За суткі — два нападзенні на людзей



**У Слуцкім раёне пенсіянер трапіў у рэанімацыю пасля нападзення раз'юшанага быка.**

Па інфармацыі УУС Мінскага аблвыканкама, з вёскі Ячава мясцовы жыхар 1950 года нараджэння быў дастаўлены ў бальніцу з папярэднім дыягназам «пералом рэбраў» і траўматычным шокам. Як расказаў сам пацярпелы, бык выбраўся з загона і накінуўся на яго. На дапамогу падаспеў сусед, а пасля і жонка з сынам. Урачы ацэньваюць стан пенсіянера як цяжкі, але стабільны. На месцы супрацоўнікі міліцыі ўдакладняюць абставіны здарэння.

У гэты ж дзень ранкам у міліцыю пазваніла загадчыца фермы ў вёсцы Маяк таго ж Слуцкага раёна: непадалёку ад будынка быў знойдзены труп 54-гадовага вартаўніка... Магчыма, мужчыну смяротна траўмаваў бык, які пакінуў памяшканне фермы, маркуючы у мясцовым РАУС. Зрэшты, гэта пакуль толькі першасная версія, разглядаюцца і іншыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Мінскі код»...



— Інакш кажучы, — уступае ў дыялог Аляксей Касцюкоўскі *(на фота)*, — наша асноўная вынаходка ўключае ў сябе больш за дзясятак дадатковых. Яно дазваляе пазбавіцца ад шкоднага выпраменьвання радыёхваль, павялічыць аб'ём, хуткасць, прапускную здольнасць і бяспеку інфармацыі, якая перадаецца. А таксама забяспечвае яе сакрэтнасць. Напрыклад, падводная лодка пасылае аптычныя імпульсы, а на іх шляху знаходзіцца праціўнік. Нават у гэтым выпадку ён не ў стане перахапіць сігналы, а тым больш расшыфраваць. Мінскі код вельмі надзейны.

**— Значыць, ваша вынаходка адкрывае вялікія магчымасці і для павышэння эфектыўнасці многіх відаў ваеннай тэхнікі? — пытаюся ў сваіх суразмоўнікаў.**

— Менавіта так. Еўразійскі патэнт, які мы атрымалі, адкрывае для прадпрыемстваў ВПК Беларусі новы сегмент сусветнага рынку, дзе можна ажыццяўляць продаж розных аптычных сістэм сувязі. Сярод найбольш перспектыўных гандлёвых партнёраў — нашы саюзнікі па АДКБ, у першую чаргу Расія, а таксама Кітай, Індыя, краіны Блізкага Усходу.

— Але ваенная сфера — толькі адзін з напрамкаў, дзе можа прымяняцца дадзеная вынаходка, — дапаўняе калегу Юрый Аксёнаў. — Галоўная ж яе мэта — вывесці на значна больш высокі ўзровень глабальнае інфармацыйнае грамадства. І наша краіна дзякуючы новым тэхналогіям у галіне аптычнай сувязі мае шанц стаць тут адной з вядучых. Вядома, у выпадку матэрыялізацыі прапанаваных ідэй.

**— У чым жа праблема?**

— А ў тым, што ўкараненне нашай вынаходкі патрабуе мільярдных укладанняў, — тлумачыць Аляксей Касцюкоўскі. Напрыклад, каб замест традыцыйных радыёхвалевых мабільнікаў з'явіліся лайтфоны, неабходна шмат крыніц светлавога выпраменьвання. Тут добрыя ўсе сродкі: і святло з вокнаў кватэр, і ўключаныя фары аўтамабіляў, што праязджаюць міма, і, вядома, вулічныя ліхтары. Іх, дарэчы, мы прапануем выкарыстоўваць як перадаючыя станцыі. Толькі вось такія прылады на Зямлі давядзецца ставіць дзе праз некалькі кіламетраў, а дзе праз кожныя 10 метраў. У космасе дыстанцыя сувязі, канешне, значна большая. Што датычыцца перашкод прыроднага характару, якія могуць ўзнікаць, то яны пераадольваюцца з дапамогай дадатковых сродкаў. Але ў любым разе новаўвядзенне прадугледжвае ў выпадку спынення падачы светлавога сігналу аўтаматычны пераход на радыёхвалі.

— Вядома, укараненне нашай аптычнай сістэмы патрабуе немалых выдаткаў. Але давайце не забываць пра галоўнае — здароўе людзей. Вось высновы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, пад эгідай якой праводзіліся даследаванні наконт уплыву бесправадных прыбораў на арганізм. Размовы па сотавым тэлефоне 30 хвілін у дзень на працягу 7—10 гадоў з вялікай доляй імавернасці могуць прывесці да ўзнікнення ў чалавека ракавай пухліны. А кітайскія навукоўцы выявілі, што выпраменьванне мабільніка прыводзіць да пашкоджання ДНК. Невыпадкова ў некаторых краінах дзецям да пэўнага ўзросту забараняюць карыстацца такімі апаратамі. Але ў цэлым, на жаль, людзі занадта бесклапотна ставяцца да небяспекі радыёхваль. Не выключана, што пастаяннае «бамбардзіраванне» імі насельніцтва ў хуткім часе выкліча масавыя захворванні. І што мы будзем рабіць тады? Асабіста я ўпэўнены, што будучае менавіта за аптычнай сувяззю.

А пакуль вынаходнікі «Мінскага кода» абіваюць парогі ў надзеі прыцягнуць увагу да сваёй вынаходкі. Некалькі гадоў іх наватарскія ідэі ў выглядзе схем, чарцяжоў і аформленых па ўсіх правілах абгрунтаванняў праляжалі ў Еўразійскім патэнтным ведамстве. Нарэшце ў студзені гэтага года навукоўцы атрымалі доўгачаканы патэнт. Праўда, ён дзейнічае толькі на тэрыторыі васьмі дзяржаў былога СССР, якія падпісалі Еўразійскую патэнтавую канвенцыю. Сярод іх і Беларусь. У іншых краінах аўтарскія правы нашых землякоў у выпадку выкарыстання іхняга ноу-хау ніхто захоўваць не збіраецца. Для ўсеагульнага прызнання трэба атрымаць адпаведны дакумент ад Сусветнай арганізацыі інтэлектуальнай уласнасці ў Швейцарыі. Спрабавалі. Аднак за гэта неабходна было ўнесці спецыяльную пошліну ў памеры 1000 долараў. Пакуль беларускія саіскальнікі міжнароднага патэнта разлічвалі на дапамогу спонсараў, прайшоў год. Менавіта такі тэрмін дае САІУ для афармлення аўтарскага права на вынаходку пасля падачы заяўкі. І цяпер, калі нашы небагатыя геніі ўжо гатовыя заплаціць з асабістых зберажэнняў, ім кажуць, што яны спазніліся. Каб паспрабаваць зноў атрымаць патэнт, які прызнаецца ў любым кутку зямнога шара, яны павінны перасягнуць саміх сябе. Гэта значыць, вынайсці штонебудзь яшчэ больш выдатнае ў сферы аптычнай сувязі. Прыходзіцца толькі здзіўляцца недарэчнасці правілаў, якія існуюць у некаторых вельмі паважаных арганізацыях.

Праўда, як з сумнай усмешкай кажа Аляксей Касцюкоўскі, нават наяўнасць міжнароднага патэнта не гарантавала б яму і яго сябру захавання іх аўтарскіх правоў. Сёння ўвесь свет бессаромна займаецца крадзяжом тэхналогій.

Вядома, калі якая-небудзь кампанія, што працуе на рынку паслуг сувязі, скарыстаецца плёнам наватарскай думкі беларускіх вучоных і не заплаціць ім належны ганарар, нашым землякам можна будзе шчыра паспачуваць. Але яшчэ больш сэрца стане рвацца ад іншага пачуцця — калі за дзяржаву крыўдна. Колькі ўжо разоў было: які-небудзь Ляўша прыдумае спосаб падкаваць блыху, а метады яго ювелірнай працы бяруць на ўзбраенне там, дзе «стрэльбы цэглай не чысцяць», дзе пільна адсочваюць найбольш каштоўныя інавацыйныя ідэі і з вялікай карысцю іх ажыццяўляюць.

**Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Кіроўца таксі збіў 69-гадовага мінчаніна

**У Цэнтральнае РУУС сталіцы звярнулася жанчына, якая паведаміла пра тое, што на паркоўцы каля дома невядомы збіў пажылога чалавека і ўцёк.**

Падзеі адбываліся на вуліцы В. Харужай. Супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі, што 69-гадовы кіроўца чакаў, пакуль жанчына вызваліць паркоўчнае месца, каб паставіць свой аўтамабіль. У гэты момант каля дома спынілася машына. Аўто 69-гадовага грамадзяніна закрывала праезд у двор, на што кіроўца, які пад'ехаў, папрасіў даць яму дарогу. Мужчына растлумачыў, што яму трэба некалькі хвілін для таго, каб прыпаркавацца, але ў адказ атрымаў абразы і некалькі ўдараў у грудзі і ў вобласць правай галёнкі. У выніку ў яго вынайшлі закрыты пералом сярэдняй трэці правай галёнкі са зрушэннем. Мужчына быў шпіталізаваны.

Супрацоўнікі міліцыі затрымалі асобу, якая аказалася датычнай да здзяйснення названых учынкаў. Ім аказаўся 52-гадовы кіроўца таксі. Мужчыну пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ад пяці да дзесяці гадоў. Ён змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |

**Предмет аукциона**
**Местоположение – Минская обл., Минский р-н**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (населенный пункт) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин** | 47,6 кв. м | 600/С-137949 | Боровлянский с/с, д. Слободщина |
| Составные части и принадлежности: крыльцо, сарай | | | |
| **Сведения о земельном участке: пл. 0,0129 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 49 200,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание магазина № 20** | 97,3 кв. м | 600/С-160436 | Щомыслицкий с/с, д. Новый Двор |
| Составные части и принадлежности: две пристройки, сарай, уборная | | | |
| **Сведения о земельном участке: пл. 0,1047 га,** предоставлен продавцу на праве аренды для обслуживания здания магазина № 20 (срок действия по 12.11.2116). Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в прибрежных полосах рек и водоемов, площадь 0,1047 га, ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей (напряжение до 1000 вольт), площадь 0,0088 га | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 60 000,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Магазин** | 156,2 кв. м | 600/С-114083 | Сеницкий с/с, д. Леонтьевичи |
| Составные части и принадлежности: пристройка, уборная | | | |
| **Сведения о земельном участке: пл. 0,0533 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений магазина № 32. | | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 116 400,00 бел. руб.** | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

**Аукцион состоится 30.07.2018 в 11.00 по адресу:**
**г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.**
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.07.2018 до 17.00 по указанному адресу.**
**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42.**
**www.cpo.by. Email: auction@cpo.by**

**1 августа 2018 г.** **№9-А/2018**

### ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку докум-ции, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 1086 по генплану) | 340100000008003385 | 0,0882 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранная зона объектов газораспределительной системы | 99 | 6 068,16 | 200,00 | 2 541,97 |
| 2 | ул. Ясная (между усадебными жилыми домами № 56 и № 60) | 340100000004001368 | 0,0771 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранные зоны линий связи и радиофикации | 99 | 6 198,24 | 200,00 | 1 746,12 |
| 3 | в зоне отдыха на левом берегу р. Сож парка культуры им. Луначарского | 340100000001006463 | 0,3449 | для строительства и обслуживания платного пляжа | охранная зона электрических сетей, прибрежная полоса рек и водоемов | 5 | 2 762,96 | 100,00 | 2 841,84 |
| 4 | по ул. Объездной, 1 | 340100000005007267 | 2,8215 | для строительства и обслуживания объекта производственного назначения | ограничений в использовании нет | 5 | 87 024,79 | 4 500,00 | 4 520,36 |
| 5 | по ул. Нижнебрилевской (поз. № 1) | 340100000004001408 | 0,0160 | для размещения легкотипного торгового павильона или павильона бытового обслуживания населения | охранная зона линий связи и радиофикации, водоохранная зона рек и водоемов | 5 | 1 330,63 | 50,00 | 2 390,40 |
| 6 | в микрорайоне № 19 (позиция № 65 по генплану) | 340100000001006221 | 0,4309 | для строительства и обслуживания банно-оздоровительного комплекса | охранная зона линий электропередачи, водоохранная зона рек и водоемов | 5 | 76 938,08 | 3 850,00 | 3 394,26 |
| 7 | в микрорайоне № 18 (позиция № 51 по генплану) | 340100000001006190 | 0,8342 | для строительства многофункционального центра с паркингом на 300 машино-мест (для жителей микрорайона) | охранная зона электрических сетей, сетей и сооружений водоснабжения, сетей и сооружений канализации, сетей и сооружений теплоснабжения | 5 | 148 334,21 | 7 450,00 | 3 113,53 |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3-6, № 3-14).

3. **Аукцион состоится 01 августа 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидцальные предпринимпатели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

Необходимые документы:

4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

**7. Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 28 июня по 30 июля 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14.**

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

Сямейная газета
Выпуск № 12 (103)

# АПОШНЯЕ ЛЕТА ДЗЯЦІНСТВА

Летнія канікулы. Сонца, радасць, воля, усмешкі на загарэлых тварах. Цікавыя прыгоды, новыя сябры і ўражанні, адпачынак і аздараўленне...

Летнія канікулы. Небяспека, боль, гора бацькоў, якое не выплакаць за ўсё жыццё. Няшчасныя выпадкі, новыя магілы на пагостах, калецтва і смерць...

Гэта два абсалютна рэальныя апісанні аднаго і таго ж паняцця, і абодва яны адпавядаюць рэчаіснасці. Але найчасцей мы ўспрымаем нармальна толькі першую частку, пра другую не хочам нават і думаць, каб, крый божа, не наклікаць бяду. А яна і без таго зусім побач, пільнуе, шукае чарговых ахвяр.

«У Лельчыцах кіроўца, рухаючыся па прылеглай тэрыторыі да аднаго з дамоў, пры павароце на паркоўку наехаў на 5-гадовую дзяўчынку, якая гуляла на праезнай частцы дарогі. У выніку дзіця шпіталізавалі ў рэанімацыю. У гэты ж дзень у Гомелі адбыўся наезд на 12-гадовага хлопчыка, які рухаўся на самакаце. Падлетка шпіталізавалі».

«У Светлагорскім раёне ў Бярэзіне патануў падлетак 2002 года нараджэння. Разам з прыяцелямі ён адправіўся купацца на рэчку ў забароненым для гэтага месцы. Дарослыя, якія знаходзіліся непадалёк, папярэдзілі пра небяспеку і забарону, падлеткі пайшлі ў іншае месца, таксама не прызначанае для купання. У нейкі момант хлопец пайшоў пад ваду».

«У Івацэвічах у гаражы свайго дома дзяўчынка націснула на кнопку закрыцця варот і хацела прайсці пад ралетай, якая апускалася, але спатыкнулася і ўпала. Вароты апусціліся на шыю дзіцяці. Дачку з-пад ралеты дастала маці. Дзяўчынку шпіталізавалі».

«У Гарадоцкім раёне васьмікласнік вырашыў прадэманстраваць свае здольнасці паркуршчыка сябрам. Падлетак палез на лінію электраперадачы, адкуль збіраўся зрабіць сальта. На вышыні 4-5 метраў ён атрымаў удар токам і ўпаў на зямлю».

«У Брэсце тралейбус наехаў на 12-гадовую школьніцу, якая перасякала праезную частку па нерэгуляваным пешаходным пераходзе на веласіпедзе, не спешыўшыся пры гэтым. У выніку дзяўчынка атрымала цяжкія цялесныя пашкоджанні галавы і была шпіталізавана ў рэанімацыю».

«Пад Лідай двое хлапчукоў — 12 і 14 гадоў — плавалі на надзіманым матрацы. На вадаёме размешчаны выратавальны пост, аднак дзеці адплывалі па-за зонай яго дзеяння. Матрац перавярнуўся, хлопчыкі апынуліся ў вадзе, сталі тануць і клікаць на дапамогу. Дзяцей выратавалі».

«У Віцебску ад відавочцаў паступіла паведамленне, што на тэхнічным балконе пятага паверха аднаго са шматпавярховікаў па вуліцы Праўды вісіць дзіця. Да моманту прыезду на месца спецыяльных службаў яно ўжо ляжала на брылі пад'езда. У цяжкім стане адзінаццацігадовага хлопчыка даставілі ў рэанімацыю, дзе ён памёр».

«У Жлобіне дзевяцікласнік і яго сябар з 7-га класа вырашылі падарваць самаробны балончык. Пасля падпалу кнота ёмістасць выбухнула ў руках старэйшага падлетка, у выніку чаго ён атрымаў частковую ампутацыю чатырох пальцаў правай кісці. Школьнік быў прааперыраваны і знаходзіцца ў рэанімацыі. У выніку выбуху пацярпелі яшчэ два падлеткі. Адзін атрымаў ірваную рану сцягна, другі — ірваныя раны абодвух перадплеччаў».

...Гэта — хроніка ўжо сёлетніх летніх канікул. Прычым мы ўзялі далёка не ўсе здарэнні. І гэта хроніка, на жаль, будзе папаўняцца амаль штодня.

Гэта не пра вас і не пра ваша дзіця? А вы дакладна ведаеце, дзе яно і чым яно займаецца, пакуль вы чытаеце гэтыя радкі?

**Ваша «Сямейная газета».**

# «ЛЮБІ СЯБЕ, КАБ ПАЛЮБІЦЬ ЖЫЦЦЁ»

## Як сямейная пара перамагла залежнасць і вырашыла дапамагаць іншым



**Уладзімір і Таццяна ШЧЭПІНЫ разам дзевяць гадоў. Абое ў шлюбе другі раз, абое па адукацыі псіхолагі, прычым прафесію асвоілі ўжо ў сталым узросце. Разам працуюць у Бягомльскім гарадскім доме культуры, ладзяць святы для гараджан. А яшчэ — зноў жа разам — арганізавалі цэнтр дапамогі «Светач» для людзей, залежных ад алкаголю і наркотыкаў. Калісьці кожны з сужэнцаў паасобку прыйшоў да выздараўлення ў групе ананімных алкаголікаў. Цяпер сямейная пара дапамагае знайсці сэнс жыцця тым, хто шукае паратунку ад адзіноты на дне шклянкі са спіртным.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

■ Сямейнае права

# ПЕНСІЙНЫ ФОНД АД МУЖА І БУДУЧАЯ ЎЛАСНАСЦЬ

## Што беларусы прапісваюць у шлюбным дагаворы, каб засцерагчы дзяцей і спадчыну



**Традыцыйны менталітэт многіх з нас прымушае лічыць, што шлюбны дагавор — гэта нешта зняважлівае, што адмаўляе сапраўдныя пачуцці. Ну якія ўмовы, калі каханне?! Але ж, на жаль, нярэдка здараецца, што каханне заканчваецца, застаецца непаразуменне, і, як вынік, — развод. І менавіта шлюбны дагавор можа пазбавіць вас ад дадатковых канфліктаў і нерваванняў. Шлюбны дагавор можна заключыць да шлюбу, падчас яго і перад разводам. Ва ўсіх трох варыянтах добраахвотная дамоўленасць мужа і жонкі спрыяе бяспецы іх капіталаў, зберагае нервы, грошы і час пры скасаванні шлюбу і здымае пытанні па атрыманні спадчыны. Хоць найчасцей у дакуменце абазначаюцца маёмасныя ўмовы, тут можна акрэсліць і пытанні адносна выхавання дзяцей і нават падзел абавязкаў па доме. Праўда, пры гэтым варта тройчы падумаць, наколькі ўмовы выканальныя, і якія сведкі ў судзе змогуць пацвердзіць, што муж не мые посуд, а жонка не выгульвае сабаку па выхадных, як прапісана ў дакуменце...**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# ДЗІЦЯЧЫЯ ПЫТАННІ

**— Жанчына працуе ў адной арганізацыі па працоўным дагаворы, у другой — па дагаворы падраду. У такой сітуацыі прызначаецца адна ці дзве дапамогі па цяжарнасці і родах?**

**Начальнік упраўлення сацыяльнага страхавання і пенсій Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Ларыса КАПЫЛЬСКАЯ:**

Пунктам 30 Палажэння аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах, зацверджанага пастановай Саўміна ад 28.06.2013 № 569, прадугледжана, што дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца па кожным месцы працы. Для атрымання дапамогі па цяжарнасці і родах па месцы працы па працоўным дагаворы і месцы працы па дагаворы падраду вам неабходна прадставіць лісткі непрацаздольнасці па кожным месцы працы. Выдача лісткоў непрацаздольнасці ажыццяўляецца ў колькасці, неабходнай для прадстаўлення па кожным месцы працы. Гэта трэба давесці да ведама доктара.

***

**— Ці можа шматдзетны бацька звярнуцца па атрыманне вольнага ад працы дня ў тыдзень, калі ён адпрацоўвае 40 гадзін у тыдзень? Ці маюць права яму адмовіць у атрыманні такой гарантыі на падставе таго, што жонка ў цяперашні час не працуе?**

**Кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ:**

Згодна з часткай другой арт. 265 Працоўнага кодэкса маці (мачысе) ці бацьку (айчыму), апекуну (папячыцелю), якая выхоўвае (які выхоўвае) дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў альбо траіх і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, па яе (яго) пісьмовай заяве выдзяляецца адзін дадатковы свабодны ад працы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку.

Парадак і ўмовы атрымання аднаго дадатковага свабоднага ад працы дня ў тыдзень вызначаны Інструкцыяй, зацверджанай пастановай Мінпрацы і сацабароны ад 11 чэрвеня 2014 г. № 34 «Аб парадку і ўмовах атрымання дадатковых свабодных ад работы дзён».

Пункт 2 гэтага дакумента змяшчае ўмовы, пры выкананні якіх выдзяляецца адзін дадатковы свабодны ад працы дзень у тыдзень:

— у сям'і работніка выхоўваецца дзіця-інвалід ва ўзросце да 18 гадоў альбо трое і больш дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў;

— работнік на гэтым рабочым тыдні заняты на працы пяць ці шэсць рабочых дзён з працягласцю працоўнага часу ў тыдзень не менш, чым устаноўлена ў артыкулах 112—114 Працоўнага кодэкса (з улікам атрыманага ў гэты тыдзень дадатковага свабоднага ад работы дня);

— другі з бацькоў (маці (мачаха), бацька (айчым)) у поўнай сям'і з'яўляецца занятым альбо праходзіць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме, прызнаны інвалідам, атрымлівае штомесячную страхавую выплату ў адпаведнасці з заканадаўствам аб абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пры гэтым пад занятымі разумеюцца грамадзяне, названыя ў артыкуле 2 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», да якіх сярод іншых адносяцца тыя, хто працуе па працоўным дагаворы (кантракце), і тыя, хто ажыццяўляе догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Калі хтосьці знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, то ён адносіцца да катэгорыі асоб, якія працуюць па працоўным дагаворы (кантракце), а калі хтосьці ажыццяўляе догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў і не працуе — да катэгорыі асоб, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў.

Такім чынам, калі ў сям'і выхоўваюцца трое дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў і жонка знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў або ажыццяўляе догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і пры гэтым не працуе, вы маеце права на дадатковы свабодны ад працы дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку пры захаванні ўмоў, устаноўленых Інструкцыяй.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО**

# ПЕНСІЙНЫ ФОНД АД МУЖА...

## Бізнесмены, творцы і вопытныя

— Плануючы сумеснае жыццё, лепш абмеркаваць са сваёй паловай розныя яго аспекты і зрабіць гэта цывілізавана, праз шлюбны дагавор. Гэта павышае культуру ўзаемаадносін у шлюбе, — мяркуе **Ала ГАСПАДАРЫК, адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў.**

— Жаданне заключыць шлюбны дагавор зусім не азначае ўзаемны недавер, і з юрыдычнага боку ў яго больш станоўчых момантаў, чым негатыўных. Такі крок — адзін з варыянтаў захаваць добрыя адносіны, у тым ліку і пасля скасавання шлюбу. Ён дазваляе таксама пазбегнуць праблем у будучыні ў паўторных шлюбах і пытаннях спадкаемства. Наяўнасць гэтага дакумента ў нейкай ступені нават дысцыплінуе сужэнцаў і павышае іх адказнасць, — лічыць **Таццяна ПАЎЛОВІЧ, натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі.** — Пра магчымасць складання шлюбнага дагавора, можа, варта было б распавядаць маладым пры падачы заявы ў загс.

У 1999 годзе, калі людзі толькі пачалі падпісваць шлюбныя дагаворы, іх былі адзінкі. Цяпер гэта тры-чатыры тысячы дакументаў штогод, і з кожным годам іх колькасць павялічваецца на 10 %. Толькі за пяць месяцаў сёлета іх у краіне падпісана ўжо 1797.

Маладыя досыць рэдка складаюць такі дагавор. Тады яшчэ каханне і давер бязмежныя, і не думаеш, што ў будучыні можа здарыцца нешта кепскае. Шлюбны дагавор падпісваюць, як правіла, тыя, хто заключае шлюб другі раз, у асноўным людзі пасля 40 гадоў. Асабліва актуальна гэта, калі абодва бакі ўжо маюць дзяцей, сумны вопыт папярэдняга сямейнага жыцця і падзелу маёмасці.

— Калі людзі жэняцца другі раз, то часта, складаючы шлюбны дагавор, кіруюцца думкай, нібыта ўсё яны пакінулі дзецям ад першага шлюбу. Таму тое, што будзе набыта цяпер, павінна дастацца дзецям ад другога шлюбу, — лічыць натарыус.

Людзі, якія працуюць у сферы бізнесу, асабліва міжнароднага, таксама часта падпісваюць шлюбны дагавор. Падзел маёмасці пры разводзе закранае не толькі набыткі сям'і, але і активы прадпрыемства. Таму, каб не быць уцягнутымі ў сямейныя канфлікты, замежныя партнёры просяць сваіх супрацоўнікаў і калег прадставіць такі дагавор.

Творчыя людзі з дапамогай дагавора намагаюцца пазбегнуць замахаў на плён сваёй працы, паколькі ўсе створаныя падчас сямейнага жыцця карціны ці скульптуры таксама лічацца сумеснай маёмасцю.

— Жонка ці муж могуць мець права на творы сужэнца, бо яны забяспечвалі ўмовы для творчасці, выконваючы работу па доме ці, можа, нават, пазіравалі, — заўважыла адвакат. — Таму шлюбны дагавор у такім выпадку — сродак абараніць свае творчыя набыткі ад падзелу.

Цяпер нават банкі пры выдачы крэдытаў пачалі цікавіцца наяўнасцю шлюбных дагавораў і патрабаваць іх для азнаямлення ў выпадку наяўнасці. Гэта важна, каб зразумець, на кім ляжыць адказнасць за пагашэнне крэдыту, бо акрамя агульных актываў (маёмасці) існуюць умовы і адносна агульных пасіваў (даўгоў).

Тым не менш часцей за ўсё дагаворы заключаюць перад скасаваннем шлюбу, падчас трохмесячнага тэрміну, які даецца сужэнцам для абдумвання рашэння, калі дакументы ўжо пададзены ў суд. Заключэнне шлюбнага дагавора ў гэты час дазваляе танней падзяліць маёмасць. Самы дарагі дагавор абыдзецца ў 203,35 рубля (натарыяльны тарыф за складанне праекта, яго засведчанне і тэхнічнае афармленне). А памер дзяржаўнай пошліны — 5 % ад сумы іску пры падзеле маёмасці. Пагадзіцеся, сумы проста несупастаўныя.

## «Фінансавае рыцарства» ці нулявы варыянт

Сапраўды, прапісаць у шлюбным дагаворы можна амаль усё: правы і абавязкі сужэнцаў аб узаемным утрыманні, парадак падзелу наяўнай і будучай маёмасці, умовы выхавання дзяцей. Праўда, як адзначаюць спецыялісты, чым больш прыватныя выпадкі стараюцца закрануць у дагаворы адносна, напрыклад, узаемаадносін паміж бацькамі і дзецьмі, тым больш відавочна, што ў сям'і памяншаецца давер сужэнцаў адно да аднаго і справа ідзе да разводу.

Пры гэтым варта памятаць, што падчас сямейнага жыцця ўмовы рэжыму ўласнасці могуць змяніцца. Напрыклад, калі кватэру, якая да шлюбу належала мужу ці жонцы, падчас існавання сям'і адрамантавалі ці рэканструявалі, яе могуць прызнаць сумеснай маёмасцю.

Тое ж датычыцца і змянення самых жорсткіх умоў дагавору, пасля нараджэння дзіцяці. Нават калі муж напачатку не надта давяраў пачуццям жонкі, пасля з'яўлення нашчадкаў ён звычайна мяняе погляд і заключае дадатковае пагадненне да шлюбнага дагавора.

— Заможны чалавек, асабліва пры вялікай розніцы ва ўзросце, часта сумняваецца, чаго больш прагне другая палова: яго асобы ці грошай. У такім выпадку, як правіла, заключаюць шлюбны дагавор па нулявым варыянце, калі маёмасць абодвух бакоў застаецца толькі ў іх уласнасці, і пры скасаванні шлюбу сужэнцы застаюцца з тым, з чым прыйшлі ў шлюб, — разважае Ала Гаспадарык. — З іншага боку, калі адносіны ў сям'і няшчырыя, нават пры наяўнасці дагавора, нічога не замінае мужу ці жонцы ў шлюбе перааформіць маёмасць на сваякоў, каб вывесці матэрыяльныя актывы з агульнай уласнасці.

Шлюбны дагавор дазваляе вызначыць рэжым маёмасці сужэнцаў на будучыню і ўстанавіць асобасную прыналежнасць у залежнасці ад таго, што яны будуць набываць у шлюбе. Захаваць сваё права на рухомую маёмасць, якую маюць сужэнцы да ўзяцця шлюбу, таксама проста. У кожнай рэчы ёсць радавыя прыкметы, якія можна абазначыць у дагаворы. Напрыклад, колер і марку халадзільніка ці тэлевізара.

— Муж і жонка такім чынам дакладна ведаюць: на чыё імя запісана маёмасць ці зроблены грашовы ўклад, уласнасцю таго яна і будзе з'яўляцца, — падкрэсліла Таццяна Паўловіч. — Рухомую маёмасць у дагавор у прынцыпе не ўключаюць, тым больш што даказаць факт яе набыцця досыць цяжка, бо копіі чэкаў у нас выдаюцца без прозвішча.

Калі дагавор падпісваюць перад скасаваннем шлюбу, у ім, як правіла, прапісваюць умовы выхавання дзіцяці і яго пражывання з кожным з бацькоў. Вызначаюць памер аліментаў на непаўналетніх дзяцей, які можа быць большы, чым той, што прадугледжаны законам, але ні ў якім разе не меншы.

— Па заканадаўстве аліменты выплачваюцца на дзяцей да дасягнення імі 18-годдзя, аднак у дагаворы можна прадугледзець выплаты на ўтрыманне, пакуль дзіця атрымлівае вышэйшую адукацыю, — адзначыла адвакат. — Было ў нас пару выпадкаў «фінансавага рыцарства», калі муж вызначаў не толькі павышаныя аліменты, але і сродкі на прыстойнае ўтрыманне жонкі, так званы пенсійны фонд, каб яна магла не працаваць, а займацца толькі выхаваннем дзіцяці. Напрыклад, 3000 долараў па курсе аліментаў штомесяц, і некалькі разоў на год — яшчэ па дзесяць тысяч еўра на аздараўленне.

## Аспрэчыць нельга прызнаць

Шлюбны дагавор можна скласці самастойна ці з дапамогай адваката, аднак найлепшы варыянт, каб прадугледзець усе магчымыя моманты, — адразу звярнуцца да натарыуса, які абавязкова павінен засведчыць дакумент. У любым выпадку, **перш чым намагацца прапісаць усе свае пажаданні, варта пракансультавацца ў натарыуса ці адваката.**

— Калі людзі скасоўваюць шлюбы, часцей за ўсё яны займаюцца толькі самім разводам. Мала хто задумваецца, што будзе з маёмасцю, ці адкладае гэтыя пытанні на пасля. Перш за ўсё вызначаюць стасункі і ўмовы жыцця дзяцей, не заяўляючы патрабаванні на маёмасць. Ужо пасля, нават праз 10 ці 20 гадоў паўстае праблема, як прадаць кватэру ці гараж, набытыя падчас шлюбу, калі не было шлюбнага дагавора. Людзі шчыра здзіўляюцца, якое дачыненне да маёмасці мае былая палова, з якой яны даўно не жывуць. Аднак каб здзейсніць продаж, трэба атрымаць згоду на гэта ад былых мужа ці жонкі. А за такі доўгі час адносіны паміж імі маглі сапсавацца. І яшчэ больш праблем можа ўзнікнуць, калі мужа ці жонкі ўжо няма ў жывых, і прыходзіцца дамаўляцца з яго спадкаемцамі, — падкрэсліла карысць шлюбнага дагавора натарыус.

Шлюбны дагавор, дарэчы, можна аспрэчыць і прызнаць нядзейсным.

— Часта гэта здараецца, калі адзін з сужэнцаў трапляе пад крымінальную адказнасць і атрымлівае артыкул з канфіскацыяй маёмасці. Каб выратаваць яе, заключаюць шлюбны дагавор ужо пасля ўзбуджэння справы. Як правіла, такія дагаворы прызнаюцца судом нядзейснымі. Можна адмяніць дзеянне дагавора і калі адзін з сужэнцаў апынаецца ў нявыгадных умовах. Напрыклад, пабудаваная ў шлюбе кватэра дастаецца мужу ці жонцы, а другому боку — нічога, — адзначыла адвакат.

Калі ў шлюбным дагаворы існуюць умовы, якія ўплываюць на ўзнікненне і пераход права на нерухомую маёмасць, то акрамя засведчання дакумента ў натарыуса, неабходна зарэгістраваць такі дагавор у кадастравым агенцтве. Калі такая ўмова не вытрымана, то дагавор таксама будзе лічыцца нядзейсным адносна маёмасці.

Пры складанні шлюбнага дагавора існуюць і некаторыя забароны. Нельга, напрыклад, унесці ў дакумент патрабаванні, якія абмяжоўваюць дзеяздольнасць аднаго з бакоў і ставяць яго ў нявыгаднае становішча. Скажам, прымусіць мужа ці жонку прытрымлівацца пэўнага веравызнання.

Як правіла, умовы шлюбных дагавораў выконваюцца беспярэчна. Аднак калі адзін з бакоў адмаўляецца выконваць дамоўленасці, вельмі проста звярнуцца да натарыуса, які складаў гэты дакумент, атрымаць выканаўчы надпіс і падаць у суд на выкананне.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# «ЛЮБІ СЯБЕ, КАБ ПАЛЮБІЦЬ ЖЫЦЦЁ»

## Самае лёгкае рашэнне

Уладзімір захоўвае цвярозасць ужо 13 гадоў, але пры гэтым па-ранейшаму называе сябе «алкаголікам, які выздараўлівае».

— Мае жыццё не было спакойным. Абраўшы кар'еру ваеннага, я прайшоў Афганістан, быў ліквідатарам аварыі на Чарнобыльскай станцыі і пры гэтым час ад часу адчуваў, быццам раблю нешта не тое. Цяпер разумею, што шукаў сэнс у жыцці, а ўсе няўдачы і стрэс «глушыў» алкаголем. Гэта была такая палачка-выручалачка, каб хутка пазбавіцца ад праблем.

Паступова і незаўважна звычка перарасла ў залежнасць. Знешне ў мужчыны было быццам бы ўсё ў парадку: сям'я, кватэра, машына. Вось толькі, як кажа Уладзімір, яго самога ў тым свеце не было. Нібы ў жарце: «Жонка папрасіла вынесці смецце — вярнуўся праз тры дні». Толькі тут «загулы» ні ў кога не выклікалі смеху. Паступова ўсе інтарэсы, былыя зацікаўленасці зніклі. Спіртное патрабавалася ўжо не для ўцёкаў ад праблем, а каб элементарна заснуць.



У каплічцы можна памаліцца альбо проста паразважаць. Цэнтр адчынены як для вернікаў, так і для агностыкаў. Галоўнае — вярнуць чалавеку страчаную духоўнасць.

— Я разумею, што праз залежнасць адбываюцца матэрыяльныя страты, губляюцца родзічы, знікае былое акружэнне... Але пакуль можна было хаваць свой стан, я гэта рабіў. Прызнацца: «Я алкаголік» — перад іншымі было страшна. У грамадстве да пітушчых ставяцца як да нечага ганебнага, абразлівага, — успамінае мужчына.

Аднойчы ў рэабілітацыйным цэнтры для афганцаў у Віцебску знаёмы параіў сустрэцца з удзельнікамі руху «Ананімныя Алкаголікі». Напачатку прапанова абурыла: мне не патрэбна, магу кінуць у любы момант! А потым падумаў і пайшоў на адну з іх сустрэч.

— Што адразу здзівіла — тыя людзі гаварылі пра залежнасць адкрыта, але выглядалі намнога лепш за мяне. Я нават не вытрымаў, выгукнуў «Якія ж вы алкаголікі? Вы паглядзіце на мяне!» Мусіць, гэтыя словы і сталі першым адкрытым прызнаннем у праблеме. На сустрэчы ўдзельнікі расказвалі свае гісторыі, а падавалася — яны гавораць пра маё жыццё.

Члены клубаў для залежных перакананыя: алкагалізм — хвароба адзіноты. Першае, што патрабуецца чалавеку, — гэта магчымасць выгаварыцца, не атрымаўшы асуджэння ў адказ. Падобнае адчуванне людзі часам атрымліваюць на споведзі, калі разам са словамі здымаюць цяжар з сэрца.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## Няпросты выбар

Пасля першай сустрэчы Уладзімір зразумеў, што хоча жыць інакш. Ён вярнуўся дамоў у Наваполацк і загарэўся ідэяй стварыць групу ананімных алкаголікаў у сваім горадзе. Паступова інфармацыя распаўсюдзілася, у групу прыйшлі людзі. Уладзімір займаўся арганізацыяй, сам быў пастаянным удзельнікам сустрэч. Але тым часам уласная сям'я развальвалася — жонка не зразумела «адноўленага» мужа.

У такой сітуацыі няма нічога парадаксальнага. Чалавек лечыцца і паступова мяняе не толькі фізічны, але і псіхалагічны стан. Пачынае самастойна прымаць рашэнні, патрабаваць права голасу. Жонцы, якая доўга знаходзілася ў нездаровых адносінах, цяжка прымірыцца са зменамі. Сузалежнасць родных — яшчэ адзін цяжкі псіхічны стан, менавіта таму для блізкіх сваякоў алкаголікаў існуе адмысловы рух, дзе вучаць, як жыць побач з залежным альбо тым, хто спрабуе кінуць.

Родныя часта «прыкрываюць» п'яных родзічаў. Даглядаюць іх, выгароджваюць, даюць грошы. Аднак самая разумная тактыка з боку сузалежнага — «адпусціць». Алкагалізм не лечыцца шкадаваннем, яго перамагаюць воляй і жаданнем змяніцца.

— У пэўны момант я зразумеў, што альбо пачну піць зноў, альбо змяню сітуацыю, — прыгадвае Уладзімір. — Ніколі не асуджаў сваю былую жонку, яна проста не змагла прыстасавацца да змен. Ёй, напэўна, хацелася, каб я заставаўся цвярозым і ў той жа час бездапаможным. Але так не бывае. Якраз тады я і сустрэў Таццяну. Напачатку не было нічога падобнага на адносіны, нам проста было цікава побач. Але ў душы ад супярэчлівых пачуццяў наступіў поўны разлад. З аднаго боку, баяўся разбурыць сям'ю, якую так доўга выбудоўваў, з другога — не мог дапусціць, каб па-сапраўднаму блізкі чалавек знік з майго жыцця. У выніку псіхолаг з цэнтра для сузалежных дапамагла разабрацца з прыярытэтамі. Я скасаваў шлюб, ажаніўся з Таццянай і з таго моманту, лічу, пачалося сапраўднае выздараўленне.

## «Гэта ён хворы, не я!»

— Бацькі не злоўжывалі спіртным, я добра вучылася ў школе — тыповая добранадзейная сям'я, — пачынае свой расказ Таццяна. — Пасля інстытута я выйшла замуж, нарадзіла дзіця. Разам з вялікімі кампаніямі любіла вясёлыя святы, пікнікі, сямейныя сустрэчы. Як заведзена, збіраліся разам за сталом, дзе сярод іншых пачастункаў быў і алкаголь. І вось неяк незаўважна і я, і мой муж пачалі піць усё больш, а адмовіцца ад лішняй чаркі станавілася ўсё складаней. Толькі тады гэта падавалася дробяззю.

На рабоце таксама было прынята «прастаўляцца» перад калегамі за нейкі поспех. «Купіла шкарпэткі — трэба абмыць, налівай!» Некаторыя рабочыя ў брыгадзе выпівалі па шклянцы і на гэтым спыняліся. Таццяна ж адчувала, што не можа спыніцца, ап'яненне выклікала эйфарыю.

Так павольна бясшкодныя святочныя застоллі ператварыліся ў пасядзелкі з бутэлькай на кухні, пачаліся п'яныя сваркі, скандалы, ранішнія правалы ў памяці.

— Хвароба паглыблялася. Цяпер і на працу я выходзіла, прыхаваўшы бутэльку. Была перакананая, што ўсе людзі насамрэч цішком п'юць, таму не буду сярод іх выдзяляцца. Канешне, гэта быў самападман, цярпенне начальства лопнула, і мяне прымусілі звольніцца. На той момант мы ўжо былі даўно ў разводзе з мужам, але па-ранейшаму жылі разам у кватэры і прыкладаліся да шклянкі па любой нагодзе. Я верыла, што ўсё з-за яго. Гэта ж ён алкаголік, ён спецыяльна даводзіць мяне да скандалаў, стварае ўмовы, каб я нервавалася і піла! Такім было маё «кароннае» апраўданне перад знаёмымі і перад уласным сумленнем.

Пры гэтым падсвядома Таццяна адчувала вялізны сорам. Пачуццё безвыходнасці расло, і нават узнікла думка, быццам усё скончана і трэба «брысці са скрухай да свайго фіналу».

Аднойчы, калі яна была ў бацькоў мужа, свёкар зачытаў аб'яву ў газеце, што ў горадзе працуе група ананімных алкаголікаў. Прайшло некалькі месяцаў. І калі аднойчы мужа зноў забралі на лячэнне, Таццяна вырашыла патэлефанаваць.



Званочак дысцыплінуе не толькі ўдзельнікаў групы, але і самога адказнага за званкі.

— Было невыносна сорамна разумець, што я (жанчына!) звяртаюся да ананімных алкаголікаў па дапамогу. На шчасце, трубку падняў Валодзя. Памятаю ашаламленне, калі іншы, незнаёмы чалавек уважліва захацеў мяне выслухаць. Я пагадзілася прыходзіць на сустрэчы клуба і на першую ўзяла з сабой мужа. Потым ён не захацеў працягваць, а я вырашыла лячыцца і месяц пратрымалася цвярозай.

Затым, як кажа жанчына, адбыўся «зрыў». Былы муж усяляк спрабаваў вярнуць «прывычную» Таню, адгаворваў ад сустрэч і патрабаваў, каб яна піла з ім «за кампанію». Пасля «загулу» ў групе ёй не было сказана ні слова асуджэння — і гэта таксама дзівіла.

Зрыў паўтарыўся, і Таццяна надумалася змяніць сацыяльны асяродак. Сабрала рэчы і пераехала да сваіх бацькоў, якія, на шчасце, падтрымалі дачку: «Жыві з намі, пакуль мы жывыя».



Прыгатаванне ежы як частка самастойнага жыцця. Здараецца, дзяжурныя кухары выкарыстоўваюць незвычайныя спалучэнні прадуктаў у сваіх стравах. Атрымліваецца дзіўна, але смачна.

— Так паступова я вярталася да паўнавартаснага жыцця, — падсумоўвае гісторыю Таццяна. — Завязаліся адносіны з Валодзем. Верыце — я тады ўпершыню закахалася — у чалавечую шчырасць і адкрытасць.

## Навучыся выказваць адзіноту

У пары былі агульныя мэты. Таццяна, як і Уладзімір, знайшла сабе спонсара (у асяродку ананімных алкаголікаў так называюць чалавека з вялікім вопытам цвярозасці, які бярэ шэфства над другім удзельнікам), стала вывучаць стан залежнасці і ў 2013 годзе скончыла Полацкі ўніверсітэт па псіхалагічнай спецыяльнасці.

У Бягомльскім цэнтры Уладзімір займае пасаду кіраўніка. Таццяна — нязменны памочнік і кансультант-псіхолаг для наведвальнікаў. Усяго цэнтр разлічаны на 10 чалавек. Ёсць як мужчынскі, так і жаночы пакой. Тыя, хто на шляху выздараўлення, жыве тут без алкаголю і спрабуе зразумець сябе. Пад'ём, прыём ежы, пачатак заняткаў па самааналізе абвяшчае званочак. Уладзімір кажа, што напачатку людзям вельмі цяжка выпрацаваць унутраную дысцыпліну.

Адметна, што адраджэннем духоўнай сферы разам з псіхолагам займаецца святар.

— Гэта не ўцаркаўленне, хутчэй, пошук унутранай апоры, — тлумачыць Уладзімір. — Ты можаш верыць у Бога, навуку, лёс — гэта тваё асабістае права. Святар праз размову дапамагае вярнуць паняцці дабрыні, любові, даверу, шчырасці, сумленнасці і г. д. У нас на сцяне ў пакоі заняткаў ёсць спіс эмоцый. Гэта вельмі важна, бо алкаголік з часам развучваецца слухаць свае пачуцці. Ён адчувае гнеў, і не можа яго вытлумачыць.

Акрамя стацыянара, у цэнтры існуе «Дом на паўшляху» — гэта часовы прытулак для людзей без жылля і дакументаў. Гэта бяспечная зона, дзе можна праходзіць лячэнне і рыхтавацца да «выхаду ў вялікі свет».

«Не будзь галодны, не будзь злы, не будзь адзінокі. Абыходзь месцы, дзе збіралася твая ранейшая кампанія. Займайся самааналізам. Любі сябе, каб палюбіць жыццё. Распазнавай маніпуляцыі і вучыся гаварыць «не». Гэта толькі частка рэкамендацый, па якіх тут вучаць жыць. Парады і матывацыя ад іншых удзельнікаў дапамагаюць трымаць спакусу пад кантролем у першыя дні. Наогул, вопыт падказвае, што без падтрымкі вылечыцца самастойна надзвычай цяжка.



Працатэрапія як частка выздараўлення. Мураваны скляпок — справа рук удзельнікаў цэнтра. Як і нарыхтоўка закатак.

— Не ведаю такіх людзей, якія б самі вылечыліся ад алкагалізму. Безумоўна, ананімныя алкаголікі не панацэя, заўсёды чалавек мае права выбару. Некаму дапамагаюць у выздараўленні жонка, бацькі, сябры, група, царква... Галоўнае, не заставацца з залежнасцю сам-насам і пастаянна ўдасканальвацца. Выздараўленне — гэта як ехаць на веласіпедзе пад горку: пакуль круціш педалі — ты рухаешся. Спынішся — упадзеш. Самы складаны перыяд для алкаголіка ўпачатку. Наперадзе невядомае, і хочацца вярнуцца ў звыклы свет. Схавацца за апраўданнем: «Хто хочаце алкаголік, толькі не я!» — кажа Уладзімір.

За час існавання цэнтра дапамогі залежным ад алкаголю і наркотыкаў «Светач» у Бягомлі праз яго прайшлі 35 чалавек. Пацыенты прыязджалі з Брэста, Оршы, Віцебска, Мінска... Арганізатары штодзень гатовы адказаць на званок і падтрымаць — нават калі гэта размова па тэлефоне. Усе каардынаты цэнтра ёсць у рэдакцыі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**

■ Фотаздымак з гісторыяй

# НЕ ТОЙ ГАСПАДАР, ЯКІ АРЭ...

**Мар'іна балота,**
**Ніхто не ймець веры,**
**Колькі ты хаваеш**
**Багацяў без меры!**
**Я. Купала**
**«Над ракою Арэсай»**

Адшукваць багацці новага вольнага жыцця на спрадвечных Мар'інскіх балотах у пасёлак Сосны (цэнтральную сядзібу першага ў краіне на асушаных меліярацыйных землях саўгаса «Х год БССР») у 1928 годзе прыехала з Капыльшчыны Марыя Дабравольская. Вырашыла шукаць лепшай долі пасля таго, як яе жаніх Антон (быў ваенны) загінуў у сутычцы з бандытамі. У пачатку 1929 года ў яе нарадзіўся сын Іосіф (на фота з матуляй у два гады). Да вайны Марыя шчыравала паляводам у саўгасе, а ўзімку на мясцовым канапляным заводзе рабочай. Іосіфу давялося вучыцца ў школе толькі чатыры гады. Мірнае жыццё абрынула вайна... Ад варожых здзекаў хаваліся сярод балот, на пясчаных выспах, паросльх сасняком, паблізу базы партызанскіх атрадаў брыгады імя Панамарэнкі. Жанчына рамантавала адзенне, мыла бялізну, малола зерне, а яе сын Іосіф быў падпаскам жывёлы.



Адразу пасля вызвалення вярнуліся ў родны пасёлак, які яшчэ падчас першай карнай аперацыі фашыстаў на дзевяносты дзень вайны быў ушчэнт разбураны, амаль усе пабудовы спалены, значная частка каштоўнасцяў вывезена. Ва ўцалелым будынку даваеннай бальніцы размясціўся варожы гарнізон. Давялося разам з суседзямі на месяцы ям для разгрузкі мінеральных угнаенняў былога чыгуначнага вакзала збудаваць для жыцця зямлянку. Марыя пайшла працаваць на пілараму. Варочала бярвёны, чапляла іх за ланцуг, каб валамі падцягнуць бліжэй да распіловачнага станка, а затым разам з рабочымі адносіла брусы, дошкі пад навесы для сушкі. У сваe пятнаццаць гадоў юнак разам са старэйшымі адшукваў у лесе паблізу пасёлка схаваныя перад прыходам ворага запчасткі ад трактароў. Валачыў іх да майстэрні. Па гэго ўспамінах усе адчулі вялікую радасць і задавальненне, калі давялося завесці першы трактар. З таго часу прыкіпеў да механізатарскай справы.

У час працы прыглядзеўся і пазнаёміўся з прыгожай, працавітай дзяўчынай Вольгай, якая пераехала ў саўгас з Мазыршчыны разам з маці і сястрой. Яна шчыравала ў звяне па вырошчванні збожжавых культур. Маладыя людзі вырашылі жыць сумесна. З дазволу кіраўніцтва саўгаса ў вольны час маладыя механізатар трактарам нацягаў шпал з былога чыгуначнага палатна. З іх збудавалі хату. Увесну 1948 года па выніках працы мінулага года група рабочых саўгаса была адзначана ўрадавымі ўзнагародамі. Сярод іх медалём «За працоўную доблесць» — Дабравольская Марыя і яе сын Вялічка Іосіф, а яго жонка Вольга — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Здаецца, усё ладзіцца ў сямейным жыцці, але Іосіфа прызываюць у армію. Пяць гадоў службы ў Румыніі маладых звязвае перапіска. З яе ён даведаўся, што нарадзіўся сын Анатоль і кіраўніцтва саўгаса выдзеліла сям'і аднапакаёўку ў толькі што збудаваным чатырохкватэрным доме.

Пасля вяртання са службы да выхаду на пенсію Іосіф працаваў механізатарам. За гэты час давялося асвойваць розныя мадыфікацыі трактароў. Каб больш дасканала ведаць тэхніку і эфектыўна яе эксплуатаваць, шмат гадоў выпісваў і зачытваў да дзірак часопіс «Сельскі механізатар». Зранку, узяўшы з сабой торбачку з ежай, накіроўваўся на мехдвор, каб своечасова падрыхтаваць жалезнага каня і, атрымаўшы заданне ад брыгадзіра, прыступіць да яго выканання. Увечары ў некалькіх словах распавядаў сям'і, колькі ўзараў альбо засеяў. З асаблівым замілаваннем успамінаў, колькі зерня адправіў падчас жніва ў складскія засекі саўгаса. З асалодай і задавальненнем ад любімай працы і дасягнутых поспехаў клаўся адпачываць, каб назаўтра зноў працягваць справу свайго жыцця. За самаадданую працу не раз адзначаўся медалямі ВДНГ і каштоўнымі падарункамі. Ганарыўся тым, што ўзнагароджаны другім медалём «За працоўную доблесць» і ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ў 1971 годзе. Нейкі час выконваў абавязкі механіка трактарнай брыгады. Дапамагаў маладзі авалодаць дасканала прафесіяй механізатара і стаць сапраўднымі хлебаробамі. Не раз паўтараў: «Не той сапраўдны гаспадар зямлі, хто яе арэ, а той, хто любуецца сваім ворывам». Лічыў, што праца з'яўляецца для чалавека асалодай і сэнсам жыцця і той, хто плённа працуе дзеля паляпшэння дабрабыту краіны, заслугоўвае павагі. Ужо на пенсіі да яго амаль штодня завітвалі маладыя механізатары па параду, як лепш эксплуатаваць тэхніку, каб працавала бездакорна ды эфектыўна шмат гадоў. Гэта была найлепшая адзнака яго шматгадовай працоўнай дзейнасці, адданасці любімай справе.

**Анатоль ВЯЛІЧКА,**
*в. Дварэц, Любанскі раён.*

# ХТО ЯЕ РАСПРАНАЕ...



**Пра карысныя якасці цыбулі людзі ведалі тысячы гадоў таму. Так, у Старажытным Егіпце пад пасадкі гэтай расліны адводзіліся вялікія надзелы зямлі. Штодзень елі цыбулю як багатыя, так і бедныя. У пашане быў і часнок, яго нават насілі як амулет. Тысячы рабоў працавалі на будоўлі пірамід, і па загадзе фараона работнікам выдаваліся цыбуля і часнок. Можа, таму і ўдалося пазбегнуць эпідэмій у час такіх маштабных работ?**

Здавён растуць цыбуля і часнок і ў агародах беларусаў. Цыбулю плялі ў коскі, абкурвалі ля печы, каб лепш захоўвалася. Звязкі цыбулі і часнаку абаранялі ад прастудных хвароб. У эпідэміі людзі маглі націрацца часнаком з ног да галавы.

Сёння прыдумана багата рэцэптаў, у складзе якіх ёсць цыбуля, у тым ліку і такіх, дзе яна — асноўны кампанент.

## Суп з цыбулі

Паўкіло салодкай рэпчатай цыбулі нарэжце тонкімі кольцамі, абваляйце ў муцэ і падсмажце ў алеі. Пасля апусціце ў булён, што закіпеў. Дадайце соль, перац, лаўровы ліст і варыце хвілін 30.

Лустачкі белага хлеба падсушыце ў духоўцы, пасыпце цёртым сырам. Пакладзіце ў талеркі і заліце гарачым супам з цыбулі.

## Салата з цыбулі-парэю

Нарэжце невялікімі кубікамі сала і абсмажце на патэльні, дадайце да яго нарэзаную цыбулю, пару лыжак вады, пасаліце, папярчыце і тушыце 5 хвілін. Дадайце вінны воцат і парэзаныя на кавалкі сасіскі. Засталося толькі заправіць салату.

## Марынаваная цыбуля

Цыбулю можна яшчэ і марынаваць і саліць. Прычым засаліць можна як карэнне, так і зялёнае пер'е. У першым выпадку недаспелыя дробныя цыбулінкі трэба заліць салёным расолам, вытрымаць 5-6 дзён пры пакаёвай тэмпературы, пасля перанесці ў халоднае месца. У другім — парэзаць лісце на два з паловай — тры сантыметры, пакласці ў слоік, дадаць духмяны перац, лаўровы ліст і перасыпаць сухой кухоннай соллю. Ужываць можна праз 2-3 тыдні.

Часцей цыбулю марынуюць у асарці з іншай агароднінай, але давайце паспрабуем зрабіць з яе нарыхтоўкі ў соку чырвоных парэчак. Цыбуліны трэба скласці ў слоікі, якія абдалі кіпнем. Падрыхтаваць марынад (на 2 кг цыбулі): ускіпяціць 1 літр вады і 300 г соку чырвонай парэчкі, 100 г цукру, 50 г солі — і заліць ім цыбулю. Слоікі трэба стэрылізаваць у кіпячай вадзе — паўлітровыя 7 хвілін, літровыя — 10. Замест чырвоных парэчак можна ўзяць чорныя парэчкі.

**Гаспадыням на заўвагу:**

✓ Каб цыбуля не прымусіла вас плакаць, калі вы яе наразаеце, змочвайце нож халоднай вадой.

✓ Каб прыбраць з нажа непрыемны пах, што пакінула цыбуля, трэба нацерці яго соллю.

✓ Вас засмучае пах цыбулі ў роце? З'ешце грэцкіх ці міндальных арэхаў.

✓ Вы нарэзалі цыбулю для салаты — абдайце яе кіпнем, так будзе смачней. У салату можна пакласці на некаторы час скарыначку жытняга хлеба, якую нацерлі часнаком. Пасля вы яе дастанеце, а тонкі, ледзьве заўважны пах застанецца.

✓ Нарэзаная цыбуля даўжэй захавае свежасць, калі яе пакласці на талерку, пасыпаную соллю.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

## ЯК ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ФОРМАЧКІ ДЛЯ ЛЁДУ

Формачкі для лёду — незаменны памочнік на кухні, які павінен быць у арсенале кожнай гаспадыні! Асабліва карысным будзе гэта прыстасаванне летам, калі на вуліцы спякота і хочацца выпіць або з'есці чаго-небудзь прахаладжальнага.



* Можна заліць у формачкі каву, замарозіць яе і дадаваць у спякоту ў малако. Атрымаецца выдатны летні напой.

* Таксама можна замарожваць ёгурт, асабліва калі ў яго невялікі тэрмін захоўвання. Гэта выдатны ласунак для лета, які некаторым людзям падабаецца нават больш, чым марозіва!





* Замарожваць фруктовае пюрэ. Гэта не толькі смачны і карысны, але і вельмі асвяжальны дэсерт!



* Замарозьце сокі з цытрусавых і дадавайце кубікі ў звычайную ваду. Лепшага прахаладжальнага напою вы не знойдзеце!



* Замарожваючы ваду, пакладзіце туды кветкі. Такі лёд можна выкарыстоўваць як упрыгожанне!

* У формачках для лёду можна гатаваць шакаладныя дэсерты, напрыклад, клубніцы ў шакаладзе!





* Замарозьце сок альясу і працірайце ім скуру. Гэта выдатны танізавальны сродак!

* Замарозьце пятрушку і кроп у аліўкавым алеі, так у вас пад рукой заўсёды будзе свежая зеляніна.





ВАРТА ВЕДАЦЬ

## КАБ КАСТРУЛІ БЫЛІ ЧЫСТЫЯ



Для гэтага спатрэбіцца палова кавалка гаспадарчага мыла, шклянка кальцыніраванай соды, невялікая бутэлечка канцылярскага сілікатнага клею (толькі не ПВА). Бяром шырокую каструлю, наліваем туды крыху больш за палову вады і ставім на агонь. Робім стружку з мыла нажом, засыпаем соду і ўліваем клей. Чакаем, пакуль гэтая сумесь закіпіць. Бяром брудную каструлю і кладзём у кіпячую сумесь. Няхай яна там пакіпіць хвілін 5—10 (у залежнасці ад забруджанасці).

Гэтая працэдура падыдзе для каструль з нержавейкі або эмаліраваных. Алюмініевыя варта «купаць» з асцярогай. Можна хвілінку патрымаць у кіпячай сумесі і «вожыкам» сцерці застарэлы тлушч.

Эмаліраваныя каструлі, якія з часам цямнеюць унутры, можна адмыць так: кладзём 1 ст. л. пральнага парашку «Бос» у каструлю, заліваем вадой роўна з беражкамі на ноч. Раніцай каструля — як новая, і без усялякіх намаганняў.

Калі падчас варкі варэння ці чаго іншага раптам прыгарае эмаліраваная каструля, трэба наліць у яе вады, насыпаць пабольш солі і паставіць на агонь. Чым мацней прыгарэла, тым даўжэй спатрэбіцца яе кіпяціць. Галоўнае — не забудзьцеся пра яе. А то і ратаваць не будзе чаго.

Прыгарэлы пласт потым адыдзе вельмі лёгка. Калі ж не, паўтарыце яшчэ раз. У выніку каструля становіцца абсалютна чыстай.

*СЯМ'Я – ГЭТА ТОЕ ПЕРШАПАЧАТКОВАЕ АСЯРОДДЗЕ, ДЗЕ ЧАЛАВЕК ПАВІНЕН ВУЧЫЦЦА РАБІЦЬ ДАБРО (Васіль Сухамлінскі).*

# Колькі каштуе вада?

## Або пяць прычын сказаць «дзякуй» бабруйскаму «Водаканалу»

**У жыцці мы даўно прывыклі да таго, што ў нашых кватэрах ёсць гарачая і халодная вада. Павярнуў вентыль крана, і яна палілася. Калі нешта і хвалюе нас, дык гэта адсутнасць вады або яе кошт. А колькі трэба сродкаў, сіл, ведаў для таго, каб яна да нас дайшла, уяўляем сабе вельмі туманна. Вось і зараз, напэўна, бабруйчане абураюцца ў душы, што ў горадзе зноў усё перакапалі, нешта там будуюць. І няўцям, што гэта якраз і звязана з тым, каб у дамах была чыстая вада, каб менш здаралася аварыйных сітуацый. Летась споўнілася роўна 90 гадоў, як прадпрыемства займаецца вельмі адказнай і карыснай справай для горада — забяспечвае яго вадой і ачышчае ад сцёкаў. Ёсць шмат прычын сказаць гораду «дзякуй», мы нагадаем галоўныя пяць.**



### Прычына № 1. ЯКАСЦЬ І НАДЗЕЙНАСЦЬ

Размова якраз пра перакапаныя бабруйскія вуліцы. У горадзе ідзе маштабная рэканструкцыя калектара. Гэта асноўная водная артэрыя горада. Яго дыяметр аграмадны — 1500 мм. Той, якім пакуль карыстаюцца бабруйчане, быў пабудаваны каля 60 гадоў таму. Ён ужо маральна і фізічна састарэў. Але сёлета ўсё пераменіцца. На рэканструкцыю гэтага аб'екта Сусветны банк выдзеліў грошы. Што дасць рэканструкцыя? Забяспечыць экалагічную бяспеку, будуць практычна цалкам выключаны непрыемныя інцыдэнты і аварыі пры эксплуатацыі трубаправода.

Абнавіць трубаправод трэба на адлегласці 2,5 кіламетра. Асноўныя напрамкі, дзе ён праходзіць, вуліцы Горкага, Гогаля, Піянерская, Інтэрнацыянальная, Маскоўская, Карла Маркса, Бахарава. Крышачку паназіраем за тым, як вядуцца работы. Адна з будаўнічых пляцовак знаходзіцца каля парку па вуліцы Інтэрнацыянальнай. За некалькі дзясяткаў метраў ад яе брыгада мантажнікаў вонкавых трубаправодаў «Водаканала» вядзе падрыхтоўчыя работы пад устройства новага каналізацыйнага калодзежа. Такіх калодзежаў павінна быць 32. Дзесьці будуць выкарыстоўвацца папярэднія, дзесьці з'явяцца новыя.

**Галоўны інжынер «Водаканала» Станіслаў ПАЎЛОЎСКІ** тлумачыць, навошта гэта трэба:

— Глыбіня залягання калектара каля 8 метраў, праводзіць работы адкрытым метадам пракладкі больш стратна і небяспечна, таму робім гэта спосабам аднаўлення трубы ў трубе шляхам палімерызацыі так званай панчохі. Матэрыял на аснове палімера заводзіцца ў трубу, награваецца да пэўнай тэмпературы і палімерызуецца. Такім чынам аднаўляецца ўнутраная сценка. Частка калодзежаў ужо зманціравана. Новыя спатрэбіліся таму, што болей чым на 200 метраў панчоха не цягнецца.

Прадпрыемства паклапацілася пра тое, каб максімальна засцерагчы ад небяспекі працуючых людзей. Пры наладцы калодзежа прымяняецца беларуская апалубка. Гэта спецыяльныя шчыты, якія ўсталёўваюцца па баках ямы і не даюць грунту абвальвацца.

— Складанасць работы ў тым, што калектар праходзіць пад шчыльнай забудовай прыватнага сектара, практычна пад агароджамі тутэйшых жыхароў, у адным месцы наогул непадалёк ад школы, — адзначае **дырэктар прадпрыемства Сяргей СКУРАТ.** — Калектар меў вельмі вялікі знос, неаднаразова адбываліся аварыйныя сітуацыі, асабліва пасля таго, як праходзілі дажджы. Пры рэканструкцыі мы выкарыстоўваем перадавыя айчынныя матэрыялы. Такія як футэраваныя трубы — гэта жалезабетон, пакрыты пластыкам, які абараняе трубу ад агрэсіўных газаў. На аб'екце гэтыя тэхналогіі прымяняюцца з улікам залягання калектара, шчыльнасці забудовы. Дзякуючы ім мы пазбегнем выдаткаў у выглядзе ўцечак. У калодзежы збіраюцца грунтовыя воды, пры зношаным калектары гэта вада паступала ў сетку, потым на каналізацыйна-помпавую станцыю (КПС). Траціліся грошы на перапампоўванне, ачыстку. Пасля рэканструкцыі мы не толькі павялічым тэрмін эксплуатацыі і пазбавімся незапланаваных страт, але і забяспечым бяспеку аб'екта і людзей. Мы ўдзячны кіраўніцтву горада, вобласці, краіны за тое, што знайшліся сродкі для рэалізацыі гэтага праекта.




### Прычына № 2. ВАДА ЯК БРЭНД ДЛЯ ГОРАДА

Акрамя стратэгічна важнага аб'екта, у прадпрыемства шмат паўсядзённай работы па забеспячэнні насельніцтва вадой і адвядзенні сцёкаў, рэканструкцыі іншых сетак, новым будаўніцтве. Летась прадпрыемства пабудавала дзве новыя КПС, што дало магчымасць правесці каналізацыю ў раён прыватнай забудовы Чарапічны. Больш за 200 дамоў змаглі падключыцца да цэнтральнай каналізацыі. Прадпрыемства выконвала работы сваімі сіламі і за свае сродкі. Насельніцтва выдаткоўвала сродкі толькі за тое, каб урэзацца ў гэтыя сеткі.

— Мы не толькі падтрымліваем тое, што было пабудавана, але яшчэ і развіваем структуру, — падкрэслівае дырэктар прадпрыемства Сяргей Скурат. — Сёлета плануем адрамантаваць чатыры кіламетры сетак пад водаадвядзенне.

На адказнасці «Водаканала» падтрыманне парадку на аб'ектах, якія размешчаны не толькі ў Бабруйску, але і ў Бабруйскім, і ў Кіраўскім раёнах. А таксама ачышчальныя збудаванні, куды сцякаюцца ўсе гарадскія сцёкі. Пры мадэрнізацыі тут выкарыстоўваліся новыя тэхналогіі, якія дазволілі камунальнікам сэканоміць немалыя сродкі. Цяпер яны ідуць на будаўніцтва новых аб'ектаў і рэканструкцыю тых, якія ўжо маюць у гэтым патрэбу. Сцёкі праходзяць усе віды ачысткі, пасля чаго вада паступае ў Бярэзіну амаль чыстая.

**Васіль ПРАВАСУД, начальнік ачышчальных збудаванняў «Водаканала»,** знаёміць з перадавым абсталяваннем:

— У нас ёсць паветрадуўныя кампрэсары, якія забяспечваюць біялагічную ачыстку сцёкавых водаў. Жыццядзейнасць мікробаў, якія перапрацоўваюць сцёкі, падтрымліваецца на неабходным узроўні.

Якасць вады ў Бабруйску высокая, адзначаюць спецыялісты, паколькі ўсё водазабеспячэнне цалкам праходзіць праз станцыі абезжалезвання. Ёсць лабараторыі, якія кантралююць ваду, што паступае ў горад, а таксама сцёкі да ачышчальных збудаванняў і пасля. Бабруйск спажывае ваду са 110 артэзіянскіх свідравін. У суткі горад «выпівае» каля 40 тысяч кубаметраў.

Дарэчы, прадпрыемства мае свой цэх па вытворчасці бутэляванай вады ёмістасцю ад 0,5 літра да амаль 20 літраў. «Наша вада — брэнд горада. І па смаку, і па змесце. Гэта ведаюць не толькі ў Бабруйску, але і ў шматлікіх рэгіёнах краіны. Мы ажыццяўлялі пастаўкі бутэляванай вады нават у Расію», — адзначае дырэктар.

### Прычына № 3. КЛОПАТ ПРА РАБОТНІКАЎ

На прадпрыемстве працуе 500 чалавек, але, як заўважае дырэктар, за кожным стаіць сям'я і можна смела памнажаць гэтую лічбу на 3. «Нашым работнікам прыходзіцца працаваць і ў выхадныя, і ў святы, і кругласутачна. І тая палавінка, якая забяспечвае тыл работніку, можна лічыць, дапамагае і нам. Трэба адзначыць яшчэ і тое, што ў нас працуе шмат дынастый». Работа і здаровы лад жыцця паняцці непадзельныя. А здароўе, у першую чаргу, гэта спорт. Фізічна падрыхтаваныя работнікі прадпрыемства спаборнічаюць не толькі паміж сабой, але і ўдзельнічаюць у гарадскіх і абласных спаборніцтвах. Як вынік — ганаровыя месцы. Бег, лыжы, валейбол, плаванне, футбол — у кожным відзе спорту ёсць свае лідары. У выніку прадпрыемства на добрым рахунку сярод падобных арганізацый з іншых гарадоў. Валейбалісты прадпрыемства ўваходзілі ў абласную каманду жыллёва-камунальнай гаспадаркі. На ўзроўні краіны займалі лідзіруючыя пазіцыі. У спартыўных мерапрыемствах таксама ўдзельнічаюць і дзеці работнікаў.

Дарэчы, на прадпрыемстве працуе лагер дзённага знаходжання для дзяцей. І работнікам не трэба ламаць галаву, куды прыстроіць сваіх сына ці дачку. Яны будуць знаходзіцца пад пільным вокам тутэйшых выхавальнікаў. А іх дзень, пакуль таты і мамы працуюць, будзе разнастайным і цікавым. Маляванне, спартыўныя спаборніцтвы, наведванне музеяў — мерапрыемстваў вельмі шмат. Прычым карысных, якія дапамагаюць развіваць кругагляд і мысленне. А работнік тым часам можа з яшчэ большай аддачай працаваць на карысць прадпрыемства.

### Прычына № 4. МУЗЕЙ ВАДЫ

Ёсць такі цікавы аб'ект у горадзе. Сюды трэба завітаць нават дзеля аднаго экспаната — шара вагой 372 кілаграмы, які можна адным пальцам варочаць на вадзяной «падушцы». Ён ляжыць у чашы з вадой і сімвалізуе ўласцівасці несціскальнасці вадкасці. І хоць музей знаходзіцца на тэрыторыі прадпрыемства, наведаць яго можа любы ахвотны. Цікава ж паглядзець, як ад коннага транспарту, на якім калісьці прывозілася вада ў горад, прадпрыемства дарасло да сучасных вельмі складаных тэхналогій. Усё гэта адбылося дзякуючы працы не аднаго пакалення. Тут жа можна ўбачыць і фота тых, хто дапамагаў прадпрыемству развівацца. Сённяшнія ветэраны не выключэнне — актыўна ўдзельнічаюць у справах роднага «Водаканала».

У музеі шмат цікавых экспанатаў. Тут можна ўбачыць калодзеж з вядром; ёсць дзеючы апарат савецкага перыяду, з якога можна папіць газаванай вады; службовыя дакументы 1944 года; люк са скульптурай водаправодчыка, падобны варыянт ёсць у Чэхіі, таму, каб не абвінавацілі ў плагіяце, ён стаіць у



музеі, а не на вуліцы; імітацыя санвузла, на прыкладзе якога тлумачаць і дзецям, і дарослым, як эканоміць ваду; кавалачак свідравіны; макет, дзе паказана, як вада падаецца на водазабор, затым станцыю абезжалезвання, паступае ў ёмістасці закрытага тыпу, потым на помпавую станцыю і далей да спажыўца. І — зваротны шлях вады ад каналізацыйнага калодзежа да Бярэзіны, уключаючы ачышчальныя збудаванні, аэратэнкі, адстойнікі, біясажалкі. Ёсць нават узоры вады, якая падвяргаецца ачыстцы (бр-р, якая ж яна чорная) і — пасля гэтага працэсу (амаль празрыстая). «Ачыстка вады — працэс дарагі, — заўважае **Анатоль АЎРАМЧЫК, намеснік дырэктара прадпрыемства «Водаканал» па сацыяльных пытаннях.**

**Да ведама**

**Прадпрыемства «Водаканал» выконвае мантажна-будаўнічыя работы па заяўках юрыдычных і фізічных асоб, займаецца пракладкай трубаправодаў, узвядзеннем збудаванняў, прыладай футляраў розных дыяметраў, так званых праколаў пад дарогамі, магістралямі, здае ў арэнду тэхніку і механізмы. Больш падрабязна з яго магчымасцямі можна азнаёміцца на сайце bobruiskvodokanal.by.**

### Прычына № 5. ЧЫРВОНАЯ ВЕЖА І «БЕЛЫ ЦЕПЛАХОД»

Акрамя асноўнай дзейнасці, прадпрыемства займаецца яшчэ шмат чым, што папаўняе яго агульную скарбонку. Рэстаран «Чырвоная вежа» — папулярнае месца сярод гараджан для правядзення вольнага часу. І зроблены ён у воданапорнай вежы. Рэстаран настолькі вядомы, што пра яго можна і не расказваць шмат. Дастаткова адзін раз наведаць. Для дзяцей існуе дзіцячая кавярня «Ласун». Знайсці яе можна на вуліцы Сацыялістычнай, там, дзе пешаходная зона. Бабруйчане ведаюць, а гасцям раім схадзіць. Не пашкадуеце.

А яшчэ ў прадпрыемства ёсць цеплаход, на якім гараджане і госці горада здзяйсняюць захапляльныя экскурсіі па рацэ. Адно засмучае, што ўзровень вады ў рацэ памяншаецца, гэта не дае на поўную моц развіваць гэтую паслугу. Ці шмат ахвотных ёю скарыстацца? Калі былі выпускныя вечары, школьнікі ў чарзе стаялі, каб пакатацца. А яшчэ бабруйчане любяць здзяйсняць водныя прагулкі ў выходныя і святочныя дні. Цікава паглядзець на родны Бабруйск збоку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

УНП 700090162



# САЛОДКІЯ МРОІ КАЛЯ ЭЙФЕЛЕВАЙ ВЕЖЫ

**Калі думаеце, што размова пойдзе пра Парыж, глыбока памыляецеся. У Бабруйску таксама ёсць Эйфелева вежа, праўда, значна меншых памераў. І стаіць яна ў самым салодкім месцы горада — перад прадпрыемствам «Чырвоны харчавік». Па адной з легендаў менавіта французы прыдумалі зефір. Летась непадалёк ад бабруйскай вежы з'явіўся і сімвал смакаты — гіганцкая канструкцыя ў выглядзе зефірыны вагой аж 200 кілаграмаў, упрыгожаная сотнямі святлодыёдных лямпачак. Атрымаўся своеасаблівы бабруйскі Парыж — папулярнае месца для адпачынку, асабліва сярод моладзі. Сёлета пры падвядзенні вынікаў конкурсу на самае лепшае святочнае ўпрыгажэнне горада перад Новым годам менавіта «Чырвоны харчавік» стаў пераможцам гэтага спаборніцтва ў сваёй намінацыі.**

## ЯК «ЧЫРВОНЫ ХАРЧАВІК» ДАПАМОГ СТВАРЫЦЬ ФЕСТЫВАЛЬ

Конкурсы, выстаўкі, дабрачынныя акцыі, святочныя мерапрыемствы — ніводная значная падзея ў жыцці Бабруйска або краіны не абыходзіцца без удзелу «Чырвонага харчавіка». Прадпрыемства радуе земляком не толькі самай смачнай і карыснай прадукцыяй на свеце, але і пастаянна клапоціцца пра іх. Вось і сёння яно будзе прымаць удзел у конкурсе-акцыі «Запрашаем смачна есці» ў родным Бабруйску. Ёсць такая традыцыя — частаваць тутэйшых жыхароў і гасцей на Дзень горада.

— Гэта калі ўсе кіраўнікі гарадскіх прадпрыемстваў збіраюцца ў адным месцы, каб пачаставаць народ чымсьці эксклюзіўным, — тлумачыць **Мікалай ГРАШЧАНКОЎ, намеснік дырэктара па ідэалагічнай і кадравай рабоце, сацыяльных і агульных пытаннях ААТ «Чырвоны харчавік».** — Усе сродкі, сабраныя на гэтай акцыі, перадаём у дзіцячы дом. Людзі ахвяруюць хто колькі зможа, для гэтага мы ўстанаўліваем спецыяльныя скрыні. Летась, напрыклад, сумеснымі намаганнямі было сабрана 5 тысяч рублёў! А падсілкавацца прапануем бясплатна. Яшчэ мы пастаянна дапамагаем дзіцячым садкам, школам. Дзесьці выдзяляем салодкую прадукцыю, дзесьці падтрымліваем іншымі спосабамі.

Дарэчы, дзякуючы прадпрыемству ў Беларусі з'явіўся яшчэ адзін фестываль. Летась канцэрн «Белдзяржхарчпрам» праводзіў на базе «Чырвонага харчавіка» чацвёрты агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці «Песня — верны сябра твой назаўсёды» сярод сваіх арганізацый. На ім прысутнічала амаль 900 чалавек. Мерапрыемства доўжылася два дні. Сёлета вырашана надаць яму статус фестывалю, прычым пад больш гучнай назвай — «Планета талентаў».

— У нас добрыя даўнія традыцыі, — кажа **дырэктар ААТ «Чырвоны харчавік» Сяргей АНЮХОЎСКІ.** — Мы не маем права рабіць нешта кепска. Нам жа хутка спаўняецца 150 гадоў. Уяўляеце, якая за нашымі плячыма гісторыя!



**Сяргей АНЮХОЎСКІ: «Наш зефір — гэта брэнд Бабруйска».**

Наколькі шчыра бабруйчане любяць «зефірную» фабрыку, можна меркаваць па тым, як тутэйшыя суб'екты гаспадарання дадаюць да сваіх назваў слова «зефір». Тут вяшчае радыё «Зефір-FM», існуе таксі з такой жа прыстаўкай.

## НОВАЕ І ЯШЧЭ БОЛЬШ СМАЧНАЕ

Як тут не прыгадаць праслаўтую Тоню Кісліцыну з любімай савецкай кінакамедыі «Дзяўчаты», у якой яна называе сотню розных страў з бульбы. Зефір, мармелад і халва таксама маюць шмат смачных формаў — тут налічваецца каля 150 відаў прадукцыі. І мяжы, як той казаў, для ўдасканалення няма.

Апошняя распрацоўка тутэйшых тэхнолагаў — найсмачнейшы на ўсім белым свеце зефір Festini. Пакуль яго можна купіць толькі ў фірменных крамах. Прадаўцы адзначаюць, што яго раскупляюць імгненна. Інфармацыя, што з'явіўся новы прадукт, які цудоўна зараджае мазгі і выклікае прыліў энергіі, тут жа распаўсюдзілася ў маладзёжным асяроддзі. Выбар — на любы густ: са смакам кавы і карыцы, какоса, махіта, рознымі іншымі адценнямі. І выглядае тавар крэатыўна. Прычым яго рознакаляровая пасыпка не проста даніна модзе, а цалкам натуральны прадукт.

Прадукцыю пад назвай «Зялёны харчавік» таксама нельга не пазнаць. Гэта лінейка была распрацаваная для тых, хто сочыць за фігурай або мае праблемы са здароўем. Да паслуг пакупніка зефір, мармелад, халва і нават дражэ без цукру. Калорый, нагадваем, там мінімальная колькасць.

— Зараз працуем над адраджэннем пасцілы бабруйскай вытворчасці 1985 года, — знаёміць з планамі дырэктар. — Наша пасціла будзе адрозніваецца ад той, якую прапануюць сёння іншыя вытворцы. У ёй усяго 10–15% яблычнага пюрэ. У класічнай пасціле — 40–50%. І мы будзем арыентавацца на гэта. Сёння людзі хочуць купляць прадукты не столькі танныя, колькі якасныя. А імідж нашай фабрыкі — якасць перш за ўсё.

**Да ведама!**

**У месяц «Чырвоны харчавік» выпускае ў сярэднім 1500 тон кандытарскіх вырабаў. Для іх рэалізацыі створана сетка фірменных крам. У параўнанні з 2014 годам, калі іх было ўсяго 7, колькасць вырасла ў разы і дасягнула 75 па краіне. На сайце, дарэчы, можаце паглядзець, якая да вас найбліжэйшая.**

## КУРС НА УСХОД

Бабруйчане пастаўляюць зефір болей чым у 20 краін свету: Расію, Прыбалтыку, Ізраіль, Амерыку, Закаўказзе. Некалькі гадоў таму быў адкрыты гандлёвы дом у Расіі, летась з'явіўся яшчэ адзін — у Баку.

— Вельмі актыўна працуем з краінамі Цэнтральнай Азіі — Таджыкістанам, Узбекістанам, — кажа Сяргей Анюхоўскі. — Гэтыя рэгіёны традыцыйна ўжываюць у вялікай колькасці салодкае. У крамах паліцы з салодкім займаюць асноўную прастору. Спадзяёмся, што наша прадукцыя прыйдзецца ім даспадобы.

З Амерыкай і Ізраілем у «Чырвонага харчавіка» даўнія сувязі. Але калі раней прадукцыя прапанавалася ў асноўным для выхадцаў з былога Саюза, то зараз зроблена стаўка на густ карэннага насельніцтва. Прыйшлося крыху змяніць рэцэптуры, і працэс, як кажуць, пайшоў. Аб'ёмы паставак у тую ж Амерыку растуць. Хутка павялічацца пастаўкі кашэрнай прадукцыі ў Ізраіль.

— Для гэтага нам прыйшлося прайсці жорсткую сертыфікацыю, выключыць з рэцэптуры некашэрныя інгрэдыенты, — кажа дырэктар. — Наогул, мы заўсёды імкнёмся адпавядаць запатрабаванням спажыўцоў.




## ЗАРАБІЦЬ ДАЁМ КОЖНАМУ

Хутка «філіял» ад «Чырвонага харчавіка» запрацуе і ў Слаўгарадзе. Да 2020 года тут плануецца наладзіць мармеладную вытворчасць. А яшчэ пачаць выпуск дэструктураванага мёду, які не крышталізуецца. Пакуль у Слаўгарадзе вядуцца падрыхтоўчыя работы, створана ўжо 11 рабочых месцаў і наладжаны выпуск драўляных паддонаў. Яны патрэбны менавіта для зефірнай вытворчасці. Натуральны прадукт любіць адпачываць на натуральных матэрыялах. Слаўгарадскі раён выбраны не выпадкова. Ён адзін з сямі, які ўвайшоў у праграму развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўшчыны. І «Чырвоны харчавік» падтрымаў дзяржпраграму. У перспектыве ў Слаўгарадзе збіраюцца стварыць болей за сто рабочых месцаў. Для раёна, дзе ёсць напружанне з працай, гэта вялікая справа.







**Бабруйскі зефір — справа тонкая.**

Дарэчы, рабочыя месцы прадпрыемства дапамагае стварыць у любой частцы Беларусі. Дастаткова адкрыць сваю справу і па франшызе рабіць бізнес на салодкім тавары. «Чырвоны харчавік» прапануе ў дапамогу свае бізнес-мадэль, брэнд і мэтавую аўдыторыю. Было б жаданне. Падрабязнасці на сайце zefir.by.

## КЛАСІКА ЗАЎСЁДЫ Ў ТРЭНДЗЕ

Апынуўшыся на прадпрыемстве, не змагла не скарыстаць магчымасць знаёмства з салодкай вытворчасцю. Мой гід — вядучы інжынер-тэхнолаг Святлана Чурыла — паказвае сапраўднае зефірнае царства. Ад салодка-ванільнага водару прыемна круціцца галава, вакол мора з белых грабеньчыкаў — безліч драўляных дошак з зефірам. «Зефірная маса гатуецца з яблычнага пюрэ, цукру, яечнага бялка, пекціну, — раскрывае сакрэт прыгатавання вядучы тэхнолаг. — Усё гэта перамешваецца, дадаецца цукрова-патачны сіроп і адпраўляецца ў спецыяльную машыну». Потым — «адпачынак» і сушка.

Над стварэннем смакаты працуюць выключна жанчыны. Цікава назіраць, як яны калышуць на канвееры зефірынкі, быццам маленькіх дзяцей. Нешта ёсць у гэтым кранальна-пяшчотнае. Кожны асобны ласунак абавязкова ўзважваецца, а потым, ужо ў другім цэху, з дзвюх палавінак зробяць гатовы прадукт.

На фабрыцы, дарэчы, ёсць участак, дзе працэс стварэння прадукцыі наогул можна заносіць у спіс народных промыслаў. Тут майстрыхі ўручную лепяць з зефіру апетытныя «грыбочкі», упрыгожваюць «шарыкі» шакаладам і іншымі не менш смачнымі пасыпкамі.

Праца карпатлівая, але прадпрыемства пастаянна клапоціцца пра тое, каб для работнікаў былі створаны зручныя ўмовы. Не дзіўна, што людзям работа падабаецца.

— І шмат у каго толькі адзін запіс у працоўнай кніжцы — ААТ «Чырвоны харчавік», — удакладняе Мікалай Грашчанкоў. — Людзі працуюць па 30–40 гадоў. Летась мы зрабілі каляндар, на якім можна ўбачыць нашых работнікаў з 20-гадовым і большым стажам разам з дзецьмі. Магчыма, гэта будучая наша змена.

Ужо на выхадзе з цэха вытворчасці класічнага зефіру знаёмімся з маладым хлопцам, які транспартуе цялежку з зефірам на сушку. А я ўжо грэшным чынам падумала, што на «Чырвоным харчавіку» працуюць толькі жанчыны. Дзмітрый Сасноўскі расказаў, што прыйшоў на прадпрыемства два гады таму і зараз паралельна атрымлівае вышэйшую адукацыю. На пытанне «Ці падабаецца табе работа?» адказвае не раздумваючы: «Прадпрыемства добрае, шмат чуў пра яго добрых водгукаў, таму вось і выбраў».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



Гэта смачнае слова «Festini».

УНП 700067279.

# ЛІДАР ПАНЭЛЬНАГА ДОМАБУДАВАННЯ



**Бабруйск горад утульны і сімпатычны. І ў гэтым ёсць заслуга мясцовага завода буйнапанэльнага домабудавання, або, як яго яшчэ скарочана тут называюць, БПД. Прадпрыемства адносна маладое, сёлета адзначае 40 гадоў свайго існавання, але рукамі яго работнікаў пабудавана ў Бабруйску больш за 80% жылля. Акрамя жылых плошчаў яно ўзводзіць сацыяльныя аб'екты і займаецца вытворчасцю арматурных канструкцый. Сярод будаўнічых арганізацый Бабруйска завод займае лідзіруючыя пазіцыі. Па выніках 2017 года ён выйшаў на першае месца.**

## Кватэра для Максіма Мірнага



Нягледзячы на адносна малады ўзрост, прадпрыемства паспела заявіць пра сябе вельмі гучна. У свой час бабруйскі завод БПД будаваў у Мінску жылы комплекс «Алімпійскі», дзе ключы ад кватэр атрымалі зоркі беларускага спорту, у тым ліку Максім Мірны. Для алімпійскіх зорак узводзілася двухузроўневае жыллё са спартыўнымі заламі на мансардных паверхах. Ёсць у прадпрыемства і вопыт супрацоўніцтва з Калінінградскай вобласцю Расіі. Адтуль бабруйскія будаўнікі прывезлі некалькі падзячных дыпломаў. Але сёння кан'юнктура рынку такая, што больш выгадна прадаваць дома. У Беларусі асноўнымі рынкамі збыту прадукцыі і паслуг прадпрыемства з'яўляюцца Бабруйск, Магілёў, паўднёва-ўсходнія раёны Магілёўскай вобласці, Мінская вобласць. Летась работнікі завода манціравалі канструкцыйную частку фізкультурна-аздараўленчага комплексу ў Асіповічах. А сёння, напрыклад, будуюць жылы дом у аграгарадку Азярыцкая Слабада Смалявіцкага раёна.

У найбліжэйшы час завод возьмецца за ўзвядзенне камерцыйнага шматкватэрнага дома на Прывакзальнай плошчы ў Бабруйску. Але асноўнае яго будаўніцтва — гэта ўсё ж жылыя дамы з дзяржпадтрымкай па Указе № 240. Цана квадратнага метра ў іх складае 750 рублёў. Гэта больш таннае жыллё, але не менш камфортнае, чым камерцыйнае. Няма ніякіх жорсткіх планіровак, наадварот, поўнае раздолле для творчасці. Летась, напрыклад, па просьбе заказчыка былі паменшаны квадратныя метры кватэры. «Наша вытворчасць хоць і буйнапанэльная, але дастаткова гнуткая, — заўважае **дырэктар завода Сяргей УЛАСІК**.

Прадпрыемства мае ўсе магчымасці ажыццяўляць будаўніцтва поўным цыклам. Для гэтага тут ёсць падраздзяленні, якія акрамя звычайных будаўнічых работ выконваюць спецыяльныя — сантэхнічныя, электрычныя, па добраўпарадкаванні тэрыторыі. Ёсць свая вытворчасць вокнаў з полівінілхларыднага профілю, уцяпляльніка з пенаполістыролу, транспартны цэх для дастаўкі канструкцый на будаўнічыя аб'екты і выканання земляных работ.



Прыклад здачы аб'екта «пад ключ» можна ўбачыць на вуліцы Шміта ў Бабруйску. Летась тут на месцы баракаў з'явіліся сімпатычныя шматпавярхоўкі з утульным дворыкам і вынесенай за яго межы аўтастаянкай. «Гэта прынцыпова новы падыход да добраўпарадкавання двара, — заўважае Сяргей Уласік. — Створаны ўсе ўмовы для актыўнага адпачынку жыхароў. А дзіцячая пляцоўка зроблена са спецыяльным мяккім пакрыццём».

Дворык сапраўды ўзорны. На праезнай частцы замест дарагога асфальту больш танны бетон. Але выглядае не горш. Шмат дзяцей гуляе на дваравых атракцыёнах. Знаёмімся з маладым бацькам, які прывёў сюды сваіх сына і дачку. Прызнаецца, што ўпершыню бачыць такое зручнае мяккае пакрыццё і вельмі ўдзячны будаўнікам за прыемную навінку.

## Дамы па навуцы

У 2013 годзе на заводзе была завершана мадэрнізацыя вытворчасці, устаноўлена сучаснае абсталяванне, створаны камфортныя ўмовы для рабочых. Усё гэта дапамагло пачаць будаваць дамы з лепшымі спажывецкімі якасцямі. Цяпло ў кватэры залежыць ад таго, наколькі добра вонкавыя сцены «захоўваюць» яго ўнутры дома. Называецца гэты паказчык супраціўленне цеплаперадачы.

— Нам быў дадзены паказчык супраціўлення цеплаперадачы вонкавых сцен да 4,35 $м^2\cdot°С/Вт$ — адзін з найлепшых у краіне, — расказвае дырэктар. — Раней ён быў — 2,5 $м^2\cdot°С/Вт$. Сцены не прамярзалі, але на сённяшні дзень ёсць новая канструкцыя, якая дазволіла паменшыць цепластраты амаль удвая. Мы павялічылі слой уцяпляльніка, а слаі пліты для вонкавай сцяны злучаем не шпоначнымі сувязямі, а з дапамогай шклапластыкавай арматуры. Яна мае цеплаправоднасць роўную нулю, і ў нас практычна няма так званых мосцікаў холаду паміж слаямі. Сумесна з нашым профільным інстытутам «Белдзяржпраект» знайшлі магчымасць пазбегнуць прамярзання тых жа стыкаў. Мы змянілі іх канструкцыю і дабіліся добрых вынікаў. Цяпер цалкам выключаны чалавечы фактар, калі па віне нядобрасумленнага работніка стык мог застацца без уцяпляльніка.

## Дом за некалькі дзён? Калі ласка!

— Любы капрыз заказчыка для нас не праблема, — запэўнівае Сяргей Уласік. — Былі б у яго жаданне і грошы. У найбліжэйшым будучым плануем набыць чатыры ўчасткі для будаўніцтва аднакватэрных жылых дамоў. За некалькі дзён такі дом можна сабраць. За трое сутак у нас будуецца два паверхі шматпавярхоўкі. Прыкладна за два тыдні манціруецца секцыя. На ўзвядзенне канструкцыйнай часткі — каробкі, ідзе некалькі тыдняў, потым збіраюцца інжынерныя сеці.



У Бабруйскім гарвыканкаме на ўліку тых, хто мае патрэбу ў жыллі, стаіць некалькі тысяч чалавек. Сёлета частка з іх справіць наваселле. Прадпрыемства збіраецца пабудаваць каля 50 тысяч квадратных метраў жылля. Для параўнання, раней у год узводзілі па 120 тысяч квадратных метраў. Зараз гэтыя аб'ёмы лішнімі б не былі, але сёння іншыя магчымасці.

## З камп'ютарным ухілам

Абсталяванне, на якім ствараюцца будучыя канструкцыі і панэлі для дома, працуе па зададзенай праграме. Укараненне новых тэхналогій дазволіла скараціць колькасць працуючых, палепшыць умовы працы і павысіць бяспеку. Сярод работнікаў хапае і жанчын. Пад кіраўніцтвам начальніка арматурнага цэха Валянціны Навіцкай 45 чалавек. З іх 8 — жанчыны. Слабы пол не горш за мужчын спраўляецца са зваркай арматуры, працуе на кране.



Работа кіпіць. Цікава паназіраць за тым, як з бетону і зробленай тут жа арматуры збіраецца панэльная пліта. З жаночага пункту гледжання працэс нагадвае прыгатаванне слаенага пірага. Перш за ўсё гаспадыня мые і змазвае маслам паддон. У справе з плітамі адбываецца тое ж самае. Паддон чысціцца, мыецца, змазваецца. Тэмп аператар задае з пульта дыстанцыйнага кіравання. Потым з дапамогай плотара на паддоне малюецца контур будучага вырабу. Па ім выстаўляецца апалубачны рамень. Затым закладваецца першы слой бетону, на яго кладзецца ўцяпляльнік, змацоўваецца шклапластыкавымі сувязямі, якія ўстанаўліваюцца для захавання цяпла, і ўсё гэта заліваецца другім слоем бетону. Але перад тым, як зняць пліту з канвеера, яе шліфуюць і толькі потым адпраўляюць на апрацоўку ў спецыяльную цеплавільготную камеру. Працэс карпатлівы і напружаны. Затое можна смела сцвярджаць, што сцены ў дамах завода БПД атрымліваюцца трывалыя і надзейныя. Можаце патэлефанаваць і яшчэ раз упэўніцца: +375 (225) 43–43–32, +375 (225) 43–28–46; факс: +375 (225) 44–69–19. Адрас: 213822, Беларусь, Магілёўская вобласць, Бабруйск, вул. Мінская, 130, ААТ «Бабруйскі завод буйнапанэльнага домабудавання».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

УНП 700016179.



**Аляксандр СТУДНЕЎ:**

# «БАБРУЙСК — ГОРАД ШЧЫРЫ І АПТЫМІСТЫЧНЫ»

**У нашай краіне часта можна пачуць выраз: «У Беларусі тры сталіцы — Мінск, Бабруйск і Плешчаніцы». Што датычыцца Плешчаніц, з націскам на «і», то гэта хутчэй за ўсё для рыфмы. А пры згадванні Бабруйска на твары не толькі жыхара Беларусі, але і жыхароў блізкага і далёкага замежжа вы ўбачыце нязменную ўсмешку і цікавасць. Напярэдадні Дня горада, які для ўсіх бабруйчан стаў добрай традыцыяй і жаданым святам, я сустрэлася са старшынёй Бабруйскага гарвыканкама Аляксандрам СТУДНЕВЫМ, і мы пагаварылі не столькі пра свята, колькі пра сам горад, які для ўсіх нас быў і застаецца загадкай.**



***— Аляксандр Віктаравіч, у кожнай мясцовасці свой твар. Калі вы прыехалі кудысьці і вам здаецца, што вы ўжо тут пабывалі, — значыць, у населенага пункта няма свайго твару, ён падобны на многія іншыя. Які твар у Бабруйска, ці можна параўнаць гэты горад з іншымі? У чым яго адметнасць і каларыт?***

— Бабруйск — горад рафінавана тонкі, яго нельга ўбачыць і з першага разу запомніць, яго трэба адчуць. Яго каларыт у дэталях, у сістэме ўзаемаадносін паміж людзьмі: беражлівымі, удумлівымі, далікатнымі, заўсёды гатовымі прыйсці на дапамогу іншаму. Бабруйск — гэта горад, які ўмее думаць, а павага да інтэлекту ў бабруйчан закладзена ў генетыцы. Геаграфічна Бабруйск у вузлавым пункце глабальных еўрапейскіх падзей мінулага. Я не буду адымаць хлеб у гісторыкаў, скажу прасцей — яшчэ ў ХХ стагоддзі гэта была свайго роду гарадская федэрацыя ў тры пласты: ваенныя, яўрэйская частка горада і беларусы. Гэтыя пласты па сутнасці ніколі не перасякаліся, яны гарманічна дапаўнялі адзін аднаго. Гэта быў свайго роду астравок талерантнасці, карэктнасці і ўмення знаходзіць агульную мову. Сёння многімі тое ўспрымаецца як мінулае, але на самай справе гэта засталося ў генетычнай памяці бабруйчан. Бабруйск — горад шчыры і аптымістычны.



На «Белшыне».

***— Што такое Бабруйск у плане эканамічнага патэнцыялу для Магілёўскай вобласці і для краіны ў цэлым?***

— Бабруйск — сёмы па колькасці насельніцтва горад Беларусі, буйны індустрыяльны цэнтр, які выпрацоўвае чацвёртую частку прамысловай прадукцыі Магілёўскай вобласці.

Прамысловасць горада — гэта сорак буйных і сярэдніх прадпрыемстваў з агульнай колькасцю работнікаў звыш 28 тысяч чалавек. За 5 месяцаў гэтага года нашымі прадпрыемствамі выраблена прадукцыі на 740 мільёнаў рублёў — са значным прыростам да мінулага года.

***— Пытанні экспарту айчыннай прадукцыі на знешнія рынкі з'яўляюцца ключавымі для нацыянальнай эканомікі. Якая дынаміка экспарту ў прадпрыемстваў Бабруйска ў пытаннях экспарту гатовай прадукцыі і ці ёсць тут праблемы?***

— Больш чым палова тавараў, якія выпрацоўваюцца на прадпрыемствах нашага горада, традыцыйна накіроўваецца на экспарт. Станоўчае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі ўжо склала каля 50 мільёнаў долараў. Узрасла выручка ад рэалізацыі прадукцыі — у 1,2 раза ў параўнанні з мінулым годам, прыбытак ад рэалізацыі — у 3,2 раза.

***— Праблема самазанятасці насельніцтва сёння з'яўляецца адной з прыярытэтных для кіраўніцтва нашай краіны. Як ідуць справы ў сферы развіцця прадпрымальніцтва ў Бабруйску? Ваш горад па праве называюць кузняй прадпрымальніцкіх кадраў, прадпрымальніцкі дух у бабруйчан у генетыцы.***

— Адначасова з развітым буйным прамысловым комплексам у нашым горадзе шырока прадстаўлена прадпрымальніцтва. Цяпер у Бабруйску працуюць амаль 1,5 тысячы прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу, а колькасць індывідуальных прадпрымальнікаў перавышае 5 тысяч чалавек. Уклад бізнесу ў бюджэт горада — 33,4 працэнта. Для параўнання: два гады таму — 27 працэнтаў. Прадпрымальніцкі сектар Бабруйска паспяхова вырашае задачу па стварэнні новых працоўных месцаў.

***— У нашай краіне распрацоўваецца стратэгія развіцця будаўнічай галіны аж да 2030 года. Будаўнічы комплекс ва ўсім свеце з'яўляецца асноўным мультыплікатарам эканомікі. Бабруйск у гэтых пытаннях у Беларусі заўсёды займаў перадавыя пазіцыі. Як ідуць справы сёння?***

— Развіваецца жыллёвае будаўніцтва — за 5 месяцаў мы ўвялі ў эксплуатацыю больш за 11 тысяч квадратных метраў жылля. Завяршаецца будаўніцтва сучаснай школы ў мікрараёне «Заходні». Не толькі для Бабруйска, але і для ўсёй Магілёўскай вобласці новая школа стане пілотным праектам па праектным заданні, задумах у арганізацыі навучальнага працэсу, працоўнага навучання, уласнай спартыўнай базы.

***— Аляксандр Віктаравіч, два гады таму два бабруйчаніны, якія жывуць сёння ў Амерыцы, пры падтрымцы гарадскіх улад устанавілі помнік, напэўна, аднаму з самых знакамітых людзей вашага горада — Эфраіму Севелу. У планах гарадскіх улад ёсць задумкі па правядзенні Севелаўскіх чытанняў або своеасаблівага фестывалю Эфраіма Севелы?***

— Гэта добрая ідэя, і ў горадзе мы пра гэта ўжо не раз казалі. Сярод многіх сусветна вядомых беларускіх пісьменнікаў ХХ стагоддзя, да якіх адносіцца і Эфраім Севела, ён займае асаблівае месца. Жанр, у якім ён пісаў, зусім асаблівы, ён прадстаўлены ўсяго некалькімі імёнамі — Ісак Бабель, Міхаіл Зошчанка, Ільф і Пятроў. Тыя пісьменнікі, якіх адносяць да паўднёварускай адэскай школы. Але Севела бабруйчанін і, запэўніваю вас, Бабруйск — гэта не Адэса, гэта нашмат больш сур'ёзна.

У плане культурных мерапрыемстваў у нас шмат планаў. Праз два гады «Чырвоны харчавік», прадукцыю якога ведаюць ва ўсім свеце па бабруйскім зефіры, будзе адзначаць сваё 150-годдзе. Гэта прадпрыемства — найстарэйшае ў краіне. Яго юбілей мы плануем не толькі вынесці за рамкі самога прадпрыемства і горада, але і зрабіць міжнародным. Што ў нас атрымаецца, пакажа час.




Адкрыццё парка моладзі.

***— Дзякуй за размову, журналісты «Звязды» сардэчна і шчыра віншуюць вас і ўсіх бабруйчан з Днём горада. Да новых сустрэч і новых адкрыццяў — Бабруйск заўсёды ўмеў і ўмее здзіўляць.***




Фота БелТА.

# ВЯРТАННЕ ПАМЯЦІ

## Мемарыяльны комплекс «Трасцянец» павінен стаць помнікам еўрапейскай значнасці

**Доўгі час пра гэта месца масавых забойстваў мала хто па-за межамі Беларусі ведаў, у Германіі Малы Трасцянец згадваўся толькі ў асобных працах гісторыкаў. Але зараз канцлагер, які дзейнічаў у наваколлі вёскі Малы Трасцянец (сёння тэрыторыя ў межах Мінска), чацвёрты па колькасці ахвяр у Другой сусветнай вайне, становіцца помнікам еўрапейскай значнасці.**

Спецыфіка масавых забойстваў у Беларусі ў тым, што тут не будавалася спецыяльная інфраструктура, напрыклад не было тых жа баракаў. Людзей прывозілі ў лес і расстрэльвалі на паляне побач з загадзя выкапаным ровам, а таксама ахвяры маглі задыхнуцца па дарозе ў так званых машынах-душагубках. У 1944 годзе Надзвычайная камісія знайшла ва ўрочышчы Благаўшчына 34 ямы, запоўненыя чалавечымі парэшткамі і попелам…

Сярод ахвяр Трасцянца ў тым ліку — цэлая школа. На дэпартацыю ў Мінск былі вывезены дырэктар яўрэйскай гімназіі ў Кёльне Эрых Клібанскі з жонкай і трыма сынамі і яговых вучні. Пра гэту і іншыя гісторыі, звязаныя з Трасцянцом, расказвае перасоўная выстаўка, якая на працягу шасці месяцаў будзе працаваць у Нацыянальнай бібліятэцы. Яе арганізатары — Міжнародны адукацыйны цэнтр (Дортмунд) і Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Ёханэса Рау ў супрацоўніцтве з фондам «Мемарыял памяці забітых яўрэяў Еўропы». Ідэя аб стварэнні выстаўкі прыйшла, калі ў Мінску распачаліся работы над мемарыяльным комплексам. Трэба сказаць, што згаданы праект унікальны, бо над зборам інфармацыі для экспазіцыі працавалі гісторыкі і музейныя работнікі Беларусі, Германіі, Чэхіі, Аўстрыі. Гэта сумеснае асэнсаванне складанага ваеннага мінулага, якое звязала народы розных краін. Таму і пазнаёміцца з ёй змогуць наведвальнікі ў розных гарадах Еўропы. Між іншым, адкрылася выстаўка ў лістападзе 2016 года ў Гамбургу, адкуль у лістападзе 1941 года ў Мінск прыбылі першыя яўрэі, якія былі тут знішчаны. Таксама выстаўка была паказана ў іншых гарадах, дзе адбываліся дэпартацыі. А ў наступным годзе яна адправіцца ў Вену. Трэба сказаць і пра праграму суправаджэння: падчас правядзення выстаўкі адбываюцца сустрэчы са сведкамі ваенных падзей, конкурсы для школьнікаў і студэнтаў.

…З вясны 1942 года да лета 1944-га ў Трасцянцы рабілася ўсё, каб не толькі знішчыць людзей, але і схаваць сляды гэтага злачынства. У канцы 1943 года спецыяльная зондэркаманда прымушала вязняў мінскіх турмаў раскопваць ямы-магілы, крукамі даставаць адтуль целы забітых людзей і спальваць. Каб не пакінуць відавочцаў, прымусовых рабочых таксама расстралялі.

Забраць жыццё, цела, памяць… Такі быў план нацыстаў. Так, сапраўды, пра вялікую колькасць людзей, знішчаных у Трасцянцы, не засталося ніякай інфармацыі. Калі на Захадзе складаліся спісы дэпартаваных, то на тэрыторыі Усходняй Еўропы ўліку ахвяр не было. Але злачынцам не ўдалося забраць памяць пра гэтае месца. У пачатку 2000-х гадоў у Беларусь з розных куткоў Еўропы пачалі прыязджаць сваякі забітых.

Адразу пасля вызвалення Мінска, у ліпені 1944 года, у Трасцянцы працавала Надзвычайная дзяржаўная камісія па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паводле ацэнкі, зробленай ёй, колькасць ахвяр — 206 500 чалавек. Як бачыце, лічбы круглыя, і сярод гісторыкаў да гэтага часу вядуцца спрэчкі вакол пытання аб дакладных маштабах трагедыі. Але бясспрэчна адно — гэты лагер смерці быў найбуйнейшы на акупаванай тэрыторыі Савецкага Саюза. Тут пазбаўляі жыцця цывільнае насельніцтва Беларусі, савецкіх ваеннапалонных, беларускіх, аўстрыйскіх, нямецкіх і чэшскіх яўрэяў, партызанаў і падпольшчыкаў. Каля 24 тысяч заходнееўрапейскіх яўрэяў былі прывезеныя ў Мінск з 1941 па 1943 год і забітыя ці ў Мінскім гета, ці ў канцлагеры «Трасцянец».



**Папераджальны шчыт у лагеры Трасцянец. Здымак зроблены Надзвычайнай дзяржаўнай камісіяй па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 года.**

Канцлагер складаўся з трох частак: лагера прымусовай працы, месца масавых расстрэлаў у Благаўшчыне і крэмацыйнай печы ва ўрочышчы Шашкоўка. Пра ўсе гэтыя пункты пакут расказвае мемарыяльны комплекс у Трасцянцы. У 2015 годзе ў памяць аб тых, хто загінуў, урачыста адкрыты манумент Брама памяці. А днямі чакаецца адкрыццё другой чаргі — мемарыяльных могілак Благаўшчына.

Інфармацыйна-дакументальная выстаўка, якую зараз можна пабачыць у Нацыянальнай бібліятэцы, складаецца з 18 раздзелаў. Яны прадстаўляюць Малы Трасцянец як месца злачынства і месца памяці. Падчас адкрыцця выстаўкі Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь Петэр Дэтмар заўважыў: «Сёння многае можна было б аддаць забыццю, таму што сведкі тых часоў сыходзяць з жыцця і застаецца ўсё менш тых, хто можа асабіста расказаць аб перажытых трагедыях. Гісторыя блякне хутка, калі яна не была часткай уласнага жыцця, таму так важна будаваць будучыню, не забываючы мінулага. Мы не хочам кансерваваць жахі, мы хочам атрымаць урокі, якія будуць арыенцірамі для будучых пакаленняў, таму нам патрэбныя такія мясціны, як Трасцянец — месца памінання і памяці, у еўрапейскім разуменні як месца сумеснай культуры памяці».


Фота БелТА.
**Выстаўку наведаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь Петэр ДЭТМАР.**

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**

# АДНОЎЛЕНЫЯ СТАРОНКІ ВАЙНЫ

## У Магілёве прэзентавалі чарговы ваенна-гістарычны зборнік па выніках нядаўніх пошукавых работ

**Такога выдання фактычна няма на ўсёй пастсавецкай прасторы, а ў Беларусі яно наогул адзінае. Кніга зроблена на энтузіязме тых, каму неабыякавы лёс краіны і кожнага асобна ўзятага яе жыхара. Яна чытаецца на адным дыханні, бо тут няма пафасу і прадузятасці. Тут выключна сапраўдны гістарычныя факты. Без купюр і скажэнняў. У абласной бібліятэцы імя Леніна сабраліся ўсе тыя, хто прымаў непасрэдны ўдзел у стварэнні 11-га выпуску Магілёўскага пошукавага весніка — пошукавікі, гісторыкі, журналісты, неабыякавыя да памяці абаронцаў нашай Радзімы людзі.**

### На голым энтузіязме

Гэты зборнік існуе ў першую чаргу, дзякуючы намаганням Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» і непасрэдна яго стваральніка і кіраўніка Мікалая Барысенкі. Чарговы выпуск зроблены сумесна з абласным Цэнтрам творчасці і пры фінансавай падтрымцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама. Свет убачыла ўсяго некалькі сотняў асобнікаў, 80 % з іх паступіць у бібліятэкі.

Налета клубу «Віккру» спаўняецца чвэрць стагоддзя. За гэтыя гады высветлены тысячы імёнаў невядомых салдат, знойдзена шмат неўстаноўленых пахаванняў часоў вайны, паднята некалькі самалётаў, збітых падчас баёў з ворагамі. На сённяшні дзень у шэрагах клуба каля 60 актывістаў, яшчэ прыкладна столькі ж прымае ўдзел у яго жыцці. Некаторыя з адданых пошукавікаў працуюць з першых гадоў існавання клуба.

— Пошукавая работа знаходзіцца на стыку ідэалогіі, адукацыі, культуры, — кажа **старшыня Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Большасць баявых ветэранаў ужо пайшла з жыцця, засталіся адзінкі. І трэба захаваць той патэнцыял, які яны неслі, на якім грунтуецца традыцыі патрыятычнага выхавання. Толькі на тэрыторыі нашай вобласці ляжаць сотні тысяч невядомых салдат. І работы па іх пошуку хопіць усім, у тым ліку сённяшняму маладому пакаленню.

На аснове навукова-папулярных выданняў клуба знята больш за 10 дакументальных фільмаў аб гісторыі вайны, гэтыя матэрыялы выкарыстаны пры стварэнні мастацкага фільма «Дняпроўскі рубеж».

### Без тэрміну даўнасці

Пошукавы веснік не абмяжоўваецца інфармацыяй толькі пра Вялікую Айчынную вайну. Яго аўтары звяртаюцца да падзей Паўночнай вайны са шведамі 1708 года. Удакладнена інфармацыя пра пазіцыі размяшчэння войскаў. Ёсць напрацоўкі па Першай сусветнай вайне.

— Нехта ўяўляе сабе, што Беларусь не мае сваіх воінскіх традыцый, — адзначае **Сяргей БЯСПАНСКІ, намеснік старшыні абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру».** — Але гэта не так. Тэматыка першай сусветнай вайны была мала вывучана. У савецкай краіне гэта было не прынята. Бо мільёны салдат змагаліся за цара. Штуршком стала выданне Мікалая Барысенкі «Рэха «Вялікай вайны» ва Усходняй Беларусі», дзе ён прывёў прозвішчы поўных Георгіеўскіх кавалераў і ўзнагароджаных Георгіеўскім крыжам. Гэтыя ўзнагароды даваліся толькі за сапраўдны подзвіг. І людзі ставіліся да такіх герояў з вялікай павагай. Потым пра іх забыліся. За апошнія чатыры гады мы знайшлі матэрыялы па 162 ураджэнцах Беларусі поўных Георгіеўскіх кавалерах. І гэта толькі пачатак. Было больш за 1,4 мільёна ўзнагароджаных, іх прозвішчы збіраліся сабраць у адну кнігу памяці. А ў 1923 годзе з 2 тысяч Георгіеўскіх алфавітаў, якія складаліся, 90 % было знішчана. Зараз мы вяртаем імёны герояў.

Новыя звесткі ёсць і па абароне Магілёва батальёнам капітана Уладзімірава, які загінуў разам з курсантамі-міліцыянерамі на подступах да абласнога цэнтра каля вёскі Гаі. У тых баях ацалелі адзінкі.

— У нас ёсць звесткі аднаго міліцыянера, удзельніка абароны Магілёва, які казаў, што месца бою яны пакінулі 22 ліпеня. Потым у яго ўспамінах гэта лічба была перакрэслена ручкай і напісана 18. Як, дарэчы, і падавалася ва ўсіх іншых савецкіх дакументах. Але ў нямецкіх данясеннях знайшлося пацвярджэнне, што «ўмацаваная вышыня ў раёне вёскі Гаі была ўзятая 21 ліпеня», — адзначыў **старшыня аблсавета ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў палкоўнік міліцыі ў запасе Яўген КАВАЛЁНАК.**

### Помнік медыцынскім сёстрам

Трагічная старонка гісторыі — гэта жанчына на вайне. Сотні тысяч дзяўчат былі на ёй разведчыцамі, сувязісткамі, снайперамі, кулямётчыцамі, кіроўцамі… Але большасць усё ж такі змагалася на перадавой у якасці санінструктараў. Адзін з артыкулаў весніка прысвечаны медсёстрам 117-й стралковай дывізіі, якія загінулі ў ліпені 1941 года ў раёне вёскі Вялікая Зімніца Слаўгарадскага раёна. Помнік ім стаіць у двары школы.

— Калі я далучыўся да пошукавага руху, помнік ужо быў, — расказвае **інжынер-электроншчык Слаўгарадскага прафесійнага ліцэя № 3, намеснік кіраўніка пошукавага атрада «Спадчына» клуба «Віккру» Аляксандр ХАЛЕЕЎ.** — Зачапіла, што на ім разам з іншымі прозвішчамі было напісана «невядомая медыцынская сястра». Праз інтэрнэт звязаўся з расійскімі калегамі, і імя ўсплыло з небыцця. Знайшліся і тыя людзі, якія ўдзельнічалі ў стварэнні помніка.

Часам невядомыя факты адкрываюцца самым нечаканым чынам. Нядаўна ў фонды абласнога краязнаўчага музея імя Раманава паступілі звесткі аб дзейнасці з восені 1941-га да мая 1943 года падпольнай антыфашысцкай ячэйкі на касцёва-перапрацоўчым жэлацінавым заводзе. Каля яе вытокаў стаяў Дзмітрый Іванаў, кіраўнік завода. Аказалася, што гэта абсалютна новыя старонкі ў гісторыі абароны Магілёва.

— У музеі шмат матэрыялаў пра Вялікую Айчынную вайну, і бывае, што адны звесткі супярэчаць другім, — адзначыла **вядучы навуковы супрацоўнік музея Аляксандра БУРАКОВА.** — Тыя, пра якія я напісала, не адлюстраваны ў афіцыйнай гістарыяграфіі. У музей прыйшоў малады чалавек са сшыткамі і паведаміў, што знайшоў іх на дачы, якую купіў. Пачалі чытаць і зразумелі, якая каштоўная інфармацыя трапіла да нас. Я патэлефанавала мужчыне, каб даведацца, у каго ён набыў дачу. Хутка высветлілася, што жанчына, якая прадала гэты дом, — унучка падпольшчыка Дзмітрыя Іванова. Яна прынесла нам дадатковыя матэрыялы пра сваю сям'ю. Гэта каштоўны набытак для нас.

### Кветкі штрафнікам

Героі Сталінградскай бітвы прызнавалі, што такіх цяжкіх баёў, як на Дняпроўскім рубяжы восенню 1943 года, не было нават на Волзе. Летась каля вёскі Драннуха Чавускага раёна паблізу ад ракі Проні па ініцыятыве клуба «Віккру» і пры падтрымцы старшыні Чавускага райвыканкама Сяргея Драздоўскага быў устаноўлены першы ў Беларусі мемарыяльны знак штрафным падраздзяленням Чырвонай арміі. Вялікую архіўна-пошукавую работу на месцах былых баёў праводзіць **Сяргей ТАГАЕЎ, выкладчык Магілёўскага прафесійнага электратэхнічнага каледжа, камандзір пошукавага атрада «Рэха вайны» клуба «Віккру».**

— Мы ўжо можам дадаць да тых падраздзяленняў, якія там указаны, 2–3 штрафныя роты, — кажа ён. — На Проні праявіў сябе 11-ы асобны штрафны батальён. Туды, як вы ведаеце, траплялі толькі афіцэры пачынаючы ад малодшага лейтэнанта. Практычна ўсе яны ляжаць на Проні, там, дзе загінулі, нават не перапахаваныя. Вайна — жахлівая справа, не да гэтага было. І тое, што штрафнікі былі здраднікамі, — гэта няпраўда. Яны жылі 1–2 атакі, бо змагаліся па-геройску. І гэтыя мужыкі зрабілі вялікі ўнёсак у нашу Перамогу. Мемарыяльныя знакі штрафнікам на прасторы былога Савецкага Саюза можна пералічыць па пальцах. Цікавы факт. Да знака ў Чавускім раёне людзі пастаянна нясуць кветкі.

За час існавання клуба «Віккру» ўстаноўлена па архівах 20 тысяч імёнаў, разам з 52-м асобным пошукавым батальёнам Мінабароны паднятыя астанкі больш за 1000 чырвонаармейцаў і камандзіраў, з іх устаноўлены імёны 73 чалавек. Антон Пракапнёў, Сяргей Якубовіч, Аляксандр Халееў, Юрый Кармазін, Ягор Шчанаў, Яўген Бацанаў, Ілья Трыханаў — гэта тыя пошукавікі, якія не шкадуюць свайго вольнага часу, каб вярнуць з небыцця імёны Герояў. І аб тым, што гэта неабходна, сведчаць лісты ад родных салдат Вялікай Айчыннай вайны, якія прыходзяць пошукавікам з усяго свету.

Аўтар гэтых радкоў з асаблівым гонарам прыняла Падзячны ліст з рук Мікалая Барысенкі за шматгадовае супрацоўніцтва і падтрымку пошукавага руху. Некалькі матэрыялаў з газеты «Звязда» па выніках пошукавых работ клуба надрукаваны ў зборніку.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

## Результаты рекламной игры «Активное лето с «Даридой»

Организатор рекламной игры – Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Нова». 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67-139 (офис. 901).

Рекламная игра «Активное лето с «Даридой» проводилась на территории Республики Беларусь.

Срок начала рекламной игры – 12 апреля 2018 года, срок окончания – 20 июля 2018 года.

Свидетельство о государственной регистрации № 3242, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 3 апреля 2018 года. УНП 191720959.

В рекламной игре участвовали 52 877 человек.

Призовой фонд разыгран полностью.

Список победителей рекламной игры по результатам двух розыгрышей опубликован на сайте www.darida.by/igra/pobediteli.html

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры 8 (017) 360-11-20.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Отдел принудительного исполнения Дубровенского района объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Ремесленникову Николаю Николаевичу.

Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: Лот №1: автомобиль РЕНО ЛАГУНА, легковой, хэтчбек, 1994 г.в. в аварийном состоянии.

Наименование, начальная цена, место нахождения: автомобиль РЕНО ЛАГУНА, легковой, хэтчбек, 1994 г.в. в аварийном состоянии, начальная цена 205,00 рублей, местонахождение – г. Дубровно, ул. Вокзальная, 30б (штрафстоянка).

Имеющиеся обременения в отношении имущества: без обременений.

Место, дата и время проведения торгов: г. Дубровно, ул. Комсомольская, 15, каб. 2, 12 июля 2018 г. в 10.00.

Справочная информация: Отдел принудительного исполнения Дубровенского района, 211587, г. Дубровно, ул. Комсомольская, 15; адрес электронной почты – upi212@minjust.by; начальник ОПИ Минькова Елена Сергеевна, тел.: 802137 53026, 8033 6878948.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 6 июля 2018 г. на счет: BY23AKBB36429030007812200000, банк – Филиал № 215 ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 210 г. Дубровно, код банка – AKBBBY21215, УНП – 300002505.

Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).

В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем)

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ИООО «Першия»

| Предмет торгов | Начальная цена, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот:**<br>1) Капитальное строение с инв. № 100/С-8234 пл. 1876,0 кв. м (назначение: здание специализированное для общественного питания, наименование: кафе быстрого питания, интернет-кафе и административные помещения), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004298 площадью 0,1578 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 28. Составные части и принадлежности: подвальный этаж.<br>2) Капитальное строение с инв. № 100/С-88738 пл. 100 кв. м (назначение: сооружение неустановленного назначения, наименование: летняя площадка), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001004298 пл. 0,1578 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Карбышева, 28. Составные части и принадлежности: летняя площадка, ограждение | 2 094 100,00 | 209 410,00 |
| **Условия продажи** | без условий | |
